Маргарыта Дмітрук ☞ 4

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Ігар Лукашук ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 42 (2788) Год LIV | Беласток, 18 кастрычніка 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Гміна Чыжы — па-беларуску

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Чыжоўская гміна ў час апошняга перапісу насельніцтва апынулася на першым месцы па адсотку насельніцтва беларускай нацыянальнасці. Ажно больш за 80% жыхароў гэтай гміны свядома назвалі сябе беларусамі. На апошніх самаўрадавых выбарах жыхары Чыжоўскай гміны паставілі на кандыдатаў ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта, якія ўзялі ўсе 15 месцаў у Радзе гміны, а войтам чарговы раз стаў Юрый Васілюк, які таксама балаціраваўся ад Беларускага камітэта. Радныя Чыжоўскай гміны 24 верасня аднагалосна прынялі пастанову аб увядзенні беларускай мовы ў якасці дапаможнай у зносінах паміж мясцовым насельніцтвам і гміннымі чыноўнікамі.

— Увядзенне пад галасаванне праекта пастановы аб дапаможнай беларускай мове было маёй ініцыятывай. Спадзяюся, што дзякуючы гэтаму наша гміна будзе магла разлічваць на атрыманне большых сродкаў на рэалізацыю культурных і адукацыйных праграм, — кажа войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк.

— Я цешуся з прынятай аднагалосна пастановы аб увядзенні дапаможнай беларускай мовы. Мы ж увялі для карыстання ў нашай гміне сваю беларускую мову. Прыняцце гэтай пастановы было станоўча ўспрынята насельніцтвам і не было засцярог у гэтай справе. Мы ж адклікаемся да нашых традыцый, культуры і адначасна ўзмацняем нацыянальную свядомасць нашага насельніцтва, — кажа старшыня Рады Валянціна Якімюк.

Аднак радныя суседняй Арлянскай гміны пайшлі намнога далей і прынялі пастанову ў справе ўсталявання ўказальнікаў на польскай і беларускай мовах (пісалі мы аб гэтым у 41 нумары „Нівы"). У такім выпадку выпадала спытацца, калі гэтае зробіць Чыжоўская.

— Не думаю я, што Рада гміны яшчэ ў гэтым годзе зоймецца двухмоўнымі ўказальнікамі. Аднак разлічваю, што будзем весці дыскусію на гэтую тэму ў наступных гадах, — мяркуе войт Юрый Васілюк. — Хаця закон прадбачвае, што рады гмін могуць прымаць адпаведныя пастановы ў гэтай справе без дадатковых кансультацый з насельніцтвам, я не прадбачваю такога рашэння. Мы будзем праводзіць кансультацыі з нашымі жыхарамі ў справе ўказальнікаў і саміх назваў сёл, прапанаваных у праекце пастановы, а голас людзей будзе рашаючым.

— Указальнікі па-польску і па-беларуску патрэбныя. Яны ж будуць паказваць на тое, што характэрнае для нас, на нашу нацыянальную адметнасць. Дошкі з двухмоўнымі назвамі мясцовасцей збліжаюць нас да Еўрасаюза, дзе такія практыкі ёсць нармальнымі. Сама разнароднасць ужо нас узбагачае, а дыскусія ў гэтай справе патрэбная нам, — кажа старшыня Рады гміны Валянціна Якімюк.

У Чыжоўскай гміне красуюцца ўжо двухмоўныя назвы вёсак — у рамках Царскага гасцінца — і гэта ўспрымаецца нармальна

— У немцаў і літоўцаў ужо ўсталяваны дошкі з назвамі мясцовасцей на дзвюх мовах, дык няхай і ў нас былі б двухмоўныя ўказальнікі, — кажа солтыс Чыжоў і заадно радны Андрэй Ціханюк.

Міла было б глянуць на двухмоўны ўказальнік Чыжоў

— Я — беларус і амаль усе людзі ў Кленіках лічаць сябе беларусамі. Гаворым мы на сваёй беларускай гаворцы. Добра было б увесці беларускія надпісы на ўказальніках. Няхай прыезджыя бачылі б, што ў Кленіках жывуць беларусы, — сказаў радны і заадно солтыс Кленік Васіль Купрыяновіч.

Можна сказаць, што радныя Чыжоўскай гміны знаходзяцца ў камфартабельных умовах у справе ўказальнікаў на беларускай мове, бо могуць карыстацца вопытам суседняй Арлянскай гміны.

— Калі Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі не будзе мець засцярог да беларускіх назваў мясцовасцей Арлянскай гміны, гэта будзе і дарога для нас, — кажа войт Юрый Васілюк. — Маю тут на ўвазе магчымасць запісвання на дошках назваў сёл так, як яны называюцца нашымі людзьмі.

Радныя нашых гмін не павінны апасацца ўсталёўвання ўказальнікаў з двухмоўнымі назвамі. Назвы сёл напісаны кірыліцай гэта для нас гонар і пашана нашых традыцый, гісторыі, роднай мовы. Трэба спадзявацца, што ўсё ж такі радныя Чыжоўскай гміны не спыняцца толькі на дапаможнай мове ў гміннай установе, але ў хуткім часе пераканаюцца, што карысна пайсці шляхам Арлянскай гміны.

З гмін Бельскага і Гайнаўскага паветаў найбольш у справах гаспадарчага развіцця пашанцавала Арлянскай гміне. Калі запланаваная інвестыцыя групы „Ікея" — сусветнага прадуцэнта мэблі будзе поўнасцю рэалізаваная ў Арлянскай гміне, знойдзе там работу каля 2 тысяч людзей, а гмінны бюджэт павінен павялічыцца на звыш 100%. Трэба да гэтага яшчэ дабавіць падаткі ад людзей, якія прыедуць жыць у Арлянскай гміне ў сувязі з новай інвестыцыяй. Калі новымі бюджэтнымі сродкамі будзе можна надалей дакладваць да атрымліваных еўрасаюзных сродкаў, Арлянская гміна будзе магла разлічваць на інвестыцыі размерам у дзесяткі мільёнаў злотых. Павінна яна ў хуткім часе стаць найбольш развітай гаспадарча вясковай гмінай на Бельшчыне і Гайнаўшчыне. Хаця будуць сюды прыязджаць людзі з усёй Польшчы, радныя Арлянскай гміны не баяліся прыняць пастанову ў справе ўсталявання двухмоўных указальнікаў. Чаго ж тады апасацца радным з іншых гмін?

Дэвальвацыя прэміі ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Ну вось і дакаціліся. Бедны Альфрэд Нобель напэўна не раз, як кажуць, у труне перавярнуўся пасля абвяшчэння чарговых вынікаў і лаўрэатаў прэміі яго імя. Ну, навука — сфера цёмная, аналізу не падлягае. А вось прэмія міру куды больш вымяральная намінацыя. І тое, што яе сёлета аддалі новаспечанаму прэзідэнту Злучаных Штатаў Амерыкі Бараку Абаму, проста шакавала людзей здаровага сэнсу. Зірнем на спіс ранейшых лаўрэатаў: Маці Тэрэза і Лех Валэнса, Далай-лама і Міхаіл Гарбачоў, „Лекары без межаў" і Андрэй Сахараў...

Люстрацыя ☞ 3

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Яўген Чыквін

Гульня ў вайну ☞ 5

Ілона КАРПЮК

Рудня — мая вёска ☞ 10

Віктар БУРА

Нашы скарбы ☞ 11

Міра ЛУКША

9 770546 196000

Дэвальвацыя прэміі

Ну вось і дакаціліся. Бедны Альфрэд Нобель напэўна не раз, як кажуць, у труне перавярнуўся пасля абвяшчэння чарговых вынікаў і лаўрэатаў прэміі яго імя. Ну, навука — сфера цёмная, аналізу не падлягае. А вось прэмія міру куды больш вымяральная намінацыя. І тое, што яе сёлета аддалі новаспечанаму прэзідэнту Злучаных Штатаў Амерыкі Бараку Абаму, проста шакавала людзей здаровага сэнсу. Зірнем на спіс ранейшых лаўрэатаў: Маці Тэрэза і Лех Валэнса, Далай-лама і Міхаіл Гарбачоў, „Лекары без межаў" і Андрэй Сахараў. Цяпер у гэтым пераліку будзе і Абама.

Небарака Барак, канешне, не вінаваты ў такім выніку. Нават каб хацеў нешта зрабіць дзеля міру ў свеце, то не паспеў. Але ж аўтарытэтны камітэт па прызначэнні найбольш прэстыжнай прэміі ў свеце нешта такое ўгледзеў у амерыканскім прэзідэнце кенійскага паходжання, чаго мы, простыя смяротныя, аніяк не можам уцяміць. І прызначыў яму гэтую прэмію, так бы мовіць, авансам. Вобразна кажучы, гэта тое самае, каб перспектыўнаму спартоўцу за гады тры да пачатку алімпіяды заранёў павесілі на шыю залаты медаль. Але тое, што немагчыма ў спорце, выяўляецца, мажлівае ў сферы грамадскай палітыкі. Дык што ж такога перспектыўнага ўгледзелі шаноўныя эксперты? Афіцыйная фармулёўка прычыны пачэснага ўганаравання: „За экстраардынарныя высілкі па ўмацаванні міжнароднай дыпламатыі і супрацоўніцтва паміж людзьмі". Ну наконт дыпламатыі, гэта ўжо становіцца зразумела ў цяперашніх палітыкаў. Гэта калі падчас выбарчай кампаніі гаворыцца адно, а пасля робіцца не зусім тое, не тое і нават адваротнае. Тут Абама безумоўна вызначыўся на міжнародным роўні. Падчас візіту ва Усходнюю Еўропу кляўся, што будзе прадаўжаць палітыку Джорджа Буша па размяшчэнні сістэмаў супрацьпаветранай ракетнай абароны ў Польшчы і Чэхіі, а пасля неяк перадумаў і заявіў супрацьлеглае. Гэткі трацкізм у сучаснай абалонцы: „Маўляў, ні міру, ні вайны, хай ідзе, як ідзе, а раптам можа выйдзе да нечага лепшага". Але „раптам" у цяперашнім драпежным свеце нічога не выходзіць. Пазіцыі сённяшняга кіраўніка магутнейшай дзяржавы свету — гэта капітуляцыя перад агрэсіўнымі мілітарысцкімі рэжымамі, якія прагнуць вайны і жыць, існаваць без яе папросту не могуць. Такая ўжо ў іх прырода. Перад такімі як, прыкладам, у Іране і Расіі. Нездарма рашэнне нобелеўскага камітэта выклікала такі станоўчы рэзананс на расійскай прасторы. Нават „зацяты сябра" Злучаных Штатаў, лідар расійскіх камуністаў Генадзь Зюганаў вельмі станоўча ацаніў такі выбар экспертаў. Аднае яго характарыстыкі дастаткова, каб зразумець сэнс таго, што адбылося. Цяпер Расія будзе ставіць свае ракеты, дзе захоча — прыкладам у Беларусі, а ЗША да гэтага і справы няма.

У розных таталітарных дзяржавах, якіх не так ужо і мала на нашай планеце, дзесяткі і сотні людзей змагаюцца за праўду, справядлівасць, галоснасць, правы чалавека, а значыць і за мір. Таму што пагрозу міру ў гэтым свеце ствараюць якраз некантраляваныя дыктатары, ваяўнічыя сатрапы, маньякі-мілітарысты (такія, як кіраўнік Ірана, шаленец Махмуд Ахмадзінежад). Але нобелеўскі камітэт чамусьці не знайшоў годных сярод тых, хто адседжвае гадамі ў турме, наўпрост рызыкуе сваім жыццём. Гэтыя кабінетныя чыноўнічкі пайшлі іншым шляхам.

Адзін з маіх знаёмых, даведаўшыся пра выбар экспертаў, доўга пляваўся, а ўрэшце не зусім цэнзурна, але трапна вымавіў, што гэта ўжо не нобелеўская, а г...нобельская прэмія. Сапраўды, прафанацыя і дэвальвацыя сёлетняй узнагароды міру відавочная. Зазірнуўшы ў спісы яе ўладальнікаў, можна выявіць, што ў пэўныя гады, не так ужо і рэдка, яна не давалася нікому. Ужо лепш было б, каб і сёлета яе нікому не давалі.

А ў 1973 годзе дыпламат з Паўночнага В'етнама Ле Дык Тхо адмовіўся ад прэміі прысуджанай яму папалам з Генры Кісінджэрам...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Мы ў Еўрасаюзе (2)

Арлянская гміна на фоне акцэсійнага рэферэндуму прыдбала асаблівую славу. Вось ужо на другі дзень пасля яго паведамілі пра яе нашы мас-медыі. Хаця жыхары Арлянскай гміны рашуча выказаліся за далучэнне да Еўрасаюза, то мас-медыі прычапіліся да рэлятыўнай прысутнасці выбаршчыкаў, найменшай у краіне. У Арлянскай гміне на выбарчыя ўчасткі прыйшло тады 27,74% выбаршчыкаў („за" прагаласавалі 655 асоб, „супраць" — толькі 233). У Чыжоўскай гміне было адпаведна 31,71%, 400 і 366, а ў Бельскай — 30,69%, 1228 і 770 асоб. Чаму мас-медыі прамаўчалі адну гміну на поўдні Польшчы, дзе амаль усе былі супраць далучэння да Еўрасаюза? Адказ на гэтае пытанне просты: бо ў Арлянскай гміне пражываюць у галоўным праваслаўныя беларусы. Чапаюць нас і будуць чапаць, а мы да гэтага прывыклі. Заўсёды, калі мова пра Орлю, то паказваюць яе як рэлікт адлеглай эпохі. І дзеля гэтага падбіраюць месцы на задворках мясцовасці. Пакажуць старую хату, брыдкую вуліцу, сабаку на іншай, але ніколі цэнтра ці іншай вуліцы з асфальтам і тратуарам...

Гэта мясцовых, хаця звыкліся з такім іміджам, заўсёды абурае. І, відаць, дастаткова жыць навонкі Орлі, каб мець скрыўленае ўяўленне пра праваслаўных беларусаў. Вось нават Пятро Нестаровіч, сын ураджэнца Орлі, вядомага кінааператара Мікалая, у сваім фільме „Руская полька" паказвае, што людзі ў Орлі карыстаюцца пральнай машынай „Франя". Гэты фільм узбурыў не аднаго жыхара Орлі, а і сам аўтар не ў пару спахапіўся і, мабыць, сорамна яму стала, бо ўпершыню гэты фільм паказаў у Гайнаўцы, а ў Орлі намнога пазней, і то прынагодна.

Вярнуся да акцэсійнага рэферэндуму, чаму ў нас людзі не пайшлі галасаваць. Многія арляне стаялі побач выбарчага ўчастка, але ўпарціліся туды не заходзіць. Мяркую, што людзі апасаліся гэтай „уніі", якая ім асацыявалася з царкоўнай і пагрозай рэлігійнага ціску. Людзі не верылі ў бяспечныя змены. Чарговы недавер выклікалі нават еўрасаюзныя грошы, якія некаторыя з іх ужо атрымлівалі. І не ўсе сяляне падалі заяўкі на земляробчыя даплаты, і зрабілі гэта свядома. Тлумачылі, што „яшчэ ніколі ніхто нічога нікому дармова не даваў"; апасаліся, што праз нейкі час тыя даплаты адбяруць назад.

Уваход у Еўрасаюз просты не быў і суправаджаўся ціхім супрацівам. Бо той Еўрасаюз заглянуў сялянам у хлявы, прымушаючы іх да істотных змен жывёльных адсекаў, паметкі ці спосабу захоўвання малака. Спярша сяляне з недаверам ставіліся да новых патрабаванняў, напрыклад, абліцоўкі жывёльных памяшканняў керамічнымі пліткамі, бо ж многія не мелі іх нават у сваіх хатах. Але перспектыва атрымання еўрасаюзных грошай і магчымасці існавання на рынку давяла да хуткага і ціхага прымянення навінак.

— Можна і сказаць, што калі не былі мы ў Еўрасаюзе, то не было столькіх турбот. Але ці гэта абазначае, што дагэтуль наша малако было такое дрэннае, а каровы не мелі прыстойных умоў бытавання? — спытаў я лекара ветэрынарыі Юзафа Бжану, бельскага павятовага інспектара па справах гігіены біялагічнага матэрыялу.

— Раней, працуючы звыш трыццаці гадоў у Арлянскай гміне, я не мог, па сутнасці, абысціся без гумавых ботаў. А бывала ўсяляк, здаралася, што каровы стаялі пад дзіравым дахам, „пад хмаркай", стаялі да кален у гнаі або хадзілі самапасам і трэба было набегацца, каб такую адну злавіць у нейкім кутку.

У Арлянскай гміне першыя малочныя рэзервуары гаспадары сталі абсталёўваць недзе ў пачатку 1990-х гадоў і тады некаторыя іхнія суседзі высмейваліся з іх. Пасля дзесяці гадоў лік гаспадарак з непасрэднай здачай малака нямнога пабольшаў — да дваццаці ва ўсёй гміне. І здаралася так, што да ўладальніка такога рэзервуара даносілі малако ягоныя суседзі; пасля ўласнік рэзервуара за тое малако плаціў, але такія рэзервуары не маглі атрымаць атэстацыі. (Мне вядома, што дзе-нідзе такія суседскія малочныя суполкі існуюць — М. М.) Калі мы апынуліся ў Еўрасаюзе, лік атэставаных гаспадарак у Арлянскай гміне пабольшаў да трыццаці-сарака.

У агульнасці ўсюды, і ў іншых гмінах, значна паменшаў лік гаспадарак, у якіх трымаюць па дзве-тры каровы. Сяляне старэюць, вёскі абязлюджваюцца і лік пастаўшчыкоў малака ўвесь час меншае. Пяць гадоў таму ў Сямятыцкім павеце жывёлаводы гадавалі каля сарака сямі тысяч кароў; падобная колькасць кароў была і ў Бельскім павеце. Знамянальнае, што ў абодвух паветах больш кароў трымаюць сяляне ў гмінах з перавагай каталіцкага насельніцтва.

Міхал МІНЦЭВІЧ

Вачыма еўрапейца

Навукоўцы для навукоўцаў

Час ад часу ў Беластоку праводзяцца вельмі цікавыя семінары, канферэнцыі і г.д, якія па-за асяроддзем іх удзельнікаў праходзяць амаль без рэха. Гэта з-за недахопу зацікаўлення мясцовых СМІ, якія лічаць іх вельмі ж нудотнымі для чытача, слухача, гледача. Так было нядаўна ў час міжнароднай канферэнцыі „Стан даследаванняў шматкультурнай спадчыны даўняй Рэчы Паспалітай". Сарганізавала яе некалькі навуковых устаноў Універсітэта ў Беластоку: Кафедра гісторыі Цэнтральна-Усходняй Еўропы (кіраваная праф. Антонам Мірановічам), Інстытут гісторыі і Гістарычна-сацыялагічны факультэт. Апрача незапрошаных журналістаў „Нівы" і Радыё „Рацыя" ніхто з прадстаўнікоў СМІ на гэтай канферэнцыі не паявіўся.

— Вы не атрымалі запрашэння? — здзівіўся ў размове з намі прафесар Мірановіч. — Гэта напэўна з-за недагляду.

Так ці іначай, знюхалі мы пра гэтае мерапрыемства. Выслухалі таксама, што аб гэтай шматвяковай спадчыне могуць сказаць даследчыкі м.інш. з Польшчы, Украіны і Беларусі. Аднак напачатку ўдзельнікам канферэнцыі быў зачытаны ліст віцэ-міністра культуры і нацыянальнай спадчыны Тамаша Мерты: „Сёння, калі ўваходзім у спрэчкі на тэму розных элементаў спадчыны Рэчы Паспалітай, пытаемся, напрыклад, ці Міцкевіч быў палякам, ці літоўцам, а можа беларусам, а Капернік палякам ці немцам, шмат даўніх грамадзян Рэчы Паспалітай было б здзіўленых нашымі пытаннямі. Для іх, менавіта, розныя маштабы тоеснасці і культурнай разнароднасці Рэчы Паспалітай дадаваліся адна да аднае, а не выключаліся. Таму чымсьці вельмі важным з'яўляецца тое, што сёння больш даспяваем да сцвярджэння, што культурная спадчына Рэчы Паспалітай — супольная ўласнасць народаў, якія пражываюць у даўніх яе межах, і мы сумеем тую спадчыну даследаваць і дзейнічаць для яе дабра".

Навукоўцы тры дні абмяркоўвалі тэмы архітэктуры, мастацтва, літаратуры і г.д. З цікавым дакладам выступіў Ігар Трусаў з Гродна. Расказаў ён аб праблемах аховы і рэстаўрацыі гродзенскіх помнікаў:

— На абласным узроўні недастаткова дзейнічае рэстаўратарская сістэма. Рэстаўратарскае будаўніцтва няўдалае.

У шмат якіх дакладах паявіўся матыў апекі над помнікамі польскай культурнай спадчыны, якія засталіся па-за цяперашнімі межамі Польшчы ды і не толькі на тэрыторыі сённяшніх Беларусі, Літвы, Украіны. Адзін з навукоўцаў прывёў прыклад Грунвальдскага помніка (кароль Уладзіслаў Ягайла на кані, трымаючы ў руках скрыжаваныя мячы). Быў ён пастаўлены на Сусветнай выстаўцы ў ЗША ў 1939 г. і там — у сувязі з выбухам вайны — ужо застаўся. Сёння ён стаіць у нью-йоркскім Сентрал-парку.

У час аднаго перапынку спыталіся мы ў Дароты Янішэўскай з Міністэрства КіНС аб праблемы з аховай польскай і супольнай культурнай спадчыны ў Беларусі:

— Па-за інвентарызацыйнымі, стараемся падтрымліваць рэстаўратарскія працы, у пэўным сэнсе выратавальныя, як у выпадку гродзенскай кафедры, у якой у 2006 г. згарэла частка галоўнага алтара. На шчасце, удалося нам правесці гэтыя працы і спадзяюся, што сёлета іх завершым.

Выступленні ў час канферэнцыі Універсітэт у Беластоку выдасць друкам. Усё ж, здаецца мне, што так як і сама канферэнцыя, гэтае выданне будзе карыстацца зацікаўленнем вузкага кола — адных навукоўцаў. Дык гэта, мабыць, не павінна здзіўляць.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Люстрацыйны абманшчык?

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Перад беластоцкім Акруговым судом пачаўся люстрацыйны працэс дэпутата ад Лявіцы Яўгена Чыквіна. Беластоцкі аддзел Інстытута нацыянальнай памяці (ІНП) абвінавачае яго ў люстрацыйнай мане, бо не прызнаўся да быццам бы супрацоўніцтва ў 1983-1989 гг. са Службай бяспекі, якая цікавілася ім ужо ў 1977 годзе. Гэта першы працэс за люстрацыйную ману беластоцкага ІНП у Падляшскім ваяводстве.

Судовы разбор пачаўся ў праслаўленай ужо зале нумар XIII, дзе праводзіліся гучныя працэсы, між іншым, боса валомінскай мафіі Генрыка Невядомскага, псеўданім „Дзяд". Абаронцам дэпутата Чыквіна з'яўляецца вядомы варшаўскі адвакат Кшыштаф Чашэйка-Сахацкі. Яшчэ да працэсу маладая па ўзросце і стажы пракурор Агнешка Русіловіч (выпускніца юрыдычнага факультэта Універсітэта ў Беластоку, працуе ў ІНП з 2007 г. ; у гэтым годзе Інстытут пачаў збіраць доказныя матэрыялы супраць падляшскага дэпутата, пасля выбараў у Сейм і паданні ім чарговай люстрацыйнай заявы), гаварыла „Ніве" з упэўненасцю:

— Інфармаваў ён СБ аб асобах, падзеях і фактах. Няма доказаў, каб атрымліваў за гэта грошы.

У размове з намі спаслалася таксама на выказванні ў прэсе дэпутата Чыквіна, якія паказаліся пару дзён да працэсу, а ў якіх ён заяўляў, чаму — на яго думку — ІНП заняўся ім і накіраваў справу ў суд: „Магу гэта тлумачыць толькі ахвотай дэскрэдытаваць мяне як дэпутата, абараняючага ў Сейме справы меншасцей. Дзеянні ІНП збегліся ў часе з маімі ініцыятывамі — я прадставіў праект пастановы аб увекавечанні акцыі разбурэння цэркваў на Холмшчыне і Падляшшы ў 1938 годзе, праект закону аб выплаце кампенсацый сем'ям ахвяр узброенага падполля. Паявіліся таксама ахвотныя пераняць мой электарат".

— Мне вядомыя гэтыя выказванні дэпутата Чыквіна. Не маюць яны сходнасці з праўдай. Пан дэпутат абараняецца як можа, бо можа многа страціць.

У судовых кулуарах журналісты задумваліся, ці дэпутат Чыквін у сувязі з працэсам павінен выступіць з сеймавага клуба, а можа на пэўны час адрачыся ад мандата ды дэпутацкага імунітэту. Клубны калега абвінавачванага дэпутата Яраслаў Матвяюк (незалежны дэпутат, па прафесіі юрыст) сказаў:

— Няма такой прычыны. Існуе ж дапушчэнне невіноўнасці. У гэтым выпадку няма працэсуальных перадумоў.

Першапачаткова, у першы дзень разбору суд і бакі мелі дапытваць сведкаў пакліканых ІНП: пажылога ўжо Збігнева Зялёнку, былога намесніка начальніка IV аддзела СБ, пасля начальніка гэтага аддзела, які займаўся касцёламі і канфесійнымі саюзамі ды Аляксандра Кірылюка, функцыянера СБ, „вядучага" Яўгена Чыквіна (зарэгістраванага як сакрэтны супрацоўнік пад псеўданімамі „Ізыдар" і „Вільгельм) у васьмідзесятыя гады. Абодва яны паявіліся ў судовай зале. Па прычыне, аднак, тлумачэнняў дэпутата, якія працягваліся пару гадзін, суддзя Беата Аліфярук рашыла, што іх дапытае на наступным разборы.

— Маюць яны даваць паказанні на тэму супрацоўніцтва СБ з панам Яўгенам Чыквіным, — адзначыла досыць энігматычна ў размове з намі пракурор Агнешка Русіловіч.

Дэтутат Чыквін засяроджана, і чытаючы з ліста, аднёсся амаль абзац за абзацам да кожнага з прадстаўленых ІНП аргументаў-доказаў. Пачаў — як гэта звычайна адбываецца ў час разбораў — ад заяўлення сваіх персанальных даных:

— Я нарадзіўся ў Орлі (...). З'яўляюся грамадзянінам Польшчы, беларускай нацыянальнасці (...). Па адукацыі я інжынер чыгуначнага транспарту (...). Я саўласнік дома і кватэры (...).

Зараз пасля заявіў:

— За ўсё сваё жыццё [з 1974 г., калі пачаў прафесійную працу — М. Х.] пастаянна спадарожнічала мне зацікаўленне ўстаноў польскай дзяржавы.

Адзначыў:

— СБ зарэгістравала мяне ў сваіх дакументах без майго ведама, надаючы мне толькі ёй вядомыя катэгорыі і псеўданімы. Зацікаўленне маёй асобай выказвала савецкае КДБ, а пасля палітычных перамен функцыянеры УОП (Установы аховы дзяржавы).

Пытаўся, быццам рытарычна:

— Занялася мною з назвы Камісія выкрывання злачынстваў супраць польскага народа [ІНП — М. Х.]. Якія злачынствы супраць польскага народа я меў учыніць? Якую пагрозу польскай дзяржаве я ствараў, што супраць мяне ангажуецца магутная ўстанова з вялікімі фінансавымі і кадравымі сродкамі?

Заадно з дакументаў ІНП, як і паказанняў дэпутата Чыквіна вынікае, што СБ была ім моцна зацікаўлена ў час, калі засноўваў Брацтва праваслаўнай моладзі і ўзначальваў беластоцкі аддзел Хрысціянскага грамадскага згуртавання (ХГЗ), якім кіраваў памерлы ўжо Казімеж Мараўскі. У абарончай мове шматразова аспрэчваў сапраўднасць і верагоднасць прадстаўленых ІНП дакументаў. Між іншым даказваў, што „не атрымаў задачы" перанесці ў другой палове 1980-х гадоў з Парыжа ў Беласток выдавецкага інстытута Service Orthodox Press.

— У сувязі з гэтай дзейнасцю быў я віжаваны службамі ПНР. СБ без майго ведама збірала інфармацыі аба мне і маіх блізкіх. Па ўказанні савецкага КДБ падслухоўваліся мае тэлефонныя размовы, аб чым я даведаўся з маёй папкі ў 1992 г., — бараніўся падляшскі парламентарый. — Ніколі ў якой-небудзь форме я не выказаў згоды на супрацоўніцтва з СБ і іншымі службамі (...). Тое, што пракурор ІНП не прадставіла, апрача функцыянераў СБ, ніякіх іншых дакументаў, чыніць з гэтых функцыянераў арбітраў справядлівасці і маральныя аўтарытэты. Расцэньваю гэта як праяву глыбокага крызісу культуры і маралі ў нашай дзяржаве. Падобна ацэньваю частку журналісцкага асяроддзя, якое замяняе людзей у агентаў.

Прывёў цытату з фільма „Пакаянне" грузінскага рэжысёра Тэнгіза Абуладзе: „Вельмі цяжка злавіць ката ў цёмным пакоі. Але мы яго зловім, калі нават яго там няма".

Успомніў пра інтэрнэтныя форумы, на якіх, у сувязі з яго справай, паявіліся галасы нянавісці ў адносінах да меншасцей, асабліва беларускай, выказваныя ў словах „ubecko-esbecka banda na ruskich usługach". Шматразовы і цяпершні дэпутат (пачаўшы з 1985 г., калі выконваў гэтую функцыю ад ХГЗ), шматразова прыпамінаў, што пяць раз падаваў люстрацыйныя заявы і быў „ачышчаны" з абвінавачанняў у супрацоўніцтве [яго прозвішча апынулася на г.зв. спіску Мацярэвіча, значыць, спіску публічных асоб, якія мелі супрацоўнічаць са службамі ПНР]:

— Ацэнку і абсяг гэтых вымушаных кантактаў, як мне здавалася, з усёўладнымі службамі, зрабіў омбудсмен публічнага інтарэсу Багуслаў Нізенскі.

Чыквін прыгадаў, што ОПП палічыў, што няма верагодных доказаў на яго супрацоўніцтва.

Пасля прызнаўся:

— Я, як публічная асоба, быў прымушаны да нейкіх кантактаў з функцыянерамі службаў.

Адзначыў прытым, што яго кантакты заўсёды адбываліся ў кампаніі трэціх асоб і аб візітах СБ у сядзібе ХГЗ інфармаваў Казімежа Мараўскага і гэтыя інфармацыі даходзілі да тагачаснага епіскапа Беластоцка-Гданьскай епархіі Савы:

— Інфармаваў я аб візітах функцыянераў свайго начальніка, старшыню ХГЗ Казімежа Мараўскага, які сказаў, што як шэф аддзела не магу зачыняць дзвярэй перад прадстаўнікамі афіцыйных дзяржаўных устаноў.

Пералічыў прозвішчы асоб, якія мелі даказаць праўду ягоных меркаванняў: Міраслава Матрэнчыка (цяпер намесніка старшыні ўправы друкарні „Orthdruk", названага дэпутатам Чыквіным дзеячам Сусветнай рады касцёлаў у Беластоку), з якім размаўляў аб выдаванні ў Польшчы бюлетэня Сусветнай федэрацыі праваслаўных брацтваў „Сіндэсмас"; Уладзіміра Місіюка, які, так як і Міраслаў Матрэнчык, мог бы пацвердзіць адносіны паміж Сусветнай радай касцёлаў і м.інш. „Сіндэсмасам"; ці Юрыя Андраюка (цяпер старшыня ўправы друкарні „Orthdruk"), якога інфармаваў аб візітах СБоўцаў. Аспрэчваў верагоднасць дакументаў, прадстаўленых ІНП, абвінавачваючы пракурора ў маніпуляцыі. Для прыкладу, спаслаўся на нататку ад 1985 г., складзеную Аляксандрам Кірылюком:

— Пракурор піша, што функцыянер даручыў сакрэтнаму супрацоўніку інфармаванне яго аб ходзе пасяджэнняў ХГЗ. У нататцы ані разу не паяўляецца слова „загадаў" ці „даручыў" ці падобныя. Кірылюк піша, што „прасіў" аб інфармацыях і запісаў, што іх не атрымаў, але таго факту пракурор не прыняў пад увагу. Такіх прыёмаў ёсць больш.

Гаварыў, што функцыянера Кірылюка ведаў, паколькі ён да яго прыходзіў, затое ніколі не бачыў Збігнева Зялёнкі. Спасылаючыся на быццам бы ягонае спатканне з функцыянерам СБ у гатэлі „Крысталь", дзе мелі абмяркоўваць дэталі яго сурацоўніцтва, запэўніваў:

— Не быў я на сустрэчы ў гатэлі „Крысталь" з ніякім функцыянерам.

Прытым спаслаўся на адну з нататак Аляксандра Кірылюка, які ў час паказанняў перад пракурорам ІНП заявіў у ёй: „Абсалютна не быў ён тайным супрацоўнікам. Калі б быў ім, абсалютна я не хадзіў бы на сустрэчы з ім у сядзібу ХГЗ. Нашы сустрэчы мелі б сакрэтны, а не афіцыйны характар. Ён, дарэчы, не хацеў з намі сустракацца".

Яўген Чыквін таксама запэўніваў:

— Я ніколі таксама ніякіх прэзентаў [ад СБ — М. Х.], а тым больш кветак не атрымаў. Няма, дарэчы, аб гэтым ніякага следу.

Пракурор Агнешка Русіловіч, у якой „Ніва" спыталася, што яна думае аб заяве дэпутата Чыквіна, што доказны матэрыял у шматлікіх выпадках сфальшаваны, а яна сама маніпулявала, адказала:

— Не буду выказвацца на тэму верагоднасці дакументаў прадстаўленых намі. Будзе іх ацэньваць суд.

Наступны разбор — 4 лістапада, у дзень Казанскай іконы Божай Маці.

Ушанаваць памяць...

У час апошняй вайны шмат савецкіх салдат загінула за вызваленне нашай Айчыны. Пасля, у мірны час, іх астанкі былі перавезены на брацкія могілкі. Але ў многіх вёсках месцы трагічных падзей былі ўвекавечаны мемарыяльнымі дошкамі. Задбалі пра гэта мясцовае насельніцтва і самаўрады. Гэта наша гісторыя і нельга пра тое забываць. А ў гмінным бюджэце маюцца грошы на гэту мэту.

Непадалёк Кузавы, пры дарозе ў Вульку-Тэрахоўскую, на ўскраіне сасновага маладняку ва ўрочышчы „Верасок", знаходзіцца занядбаная магіла. У ёй былі пахаваны танкісты пяці разбітых савецкіх танкаў. Непадалёк ад таго месца была разбіта шостая машына, якой вадзіцелем быў Міхаіл Купрыянавіч Чупілка, якому пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Усе яны змагаліся за вызваленне Чаромхаўскай зямлі. Ці не заслужылі яны, каб месца іх гібелі ўшанаваць памятнай дошкай? Чаму мясцовае насельніцтва так неакуратна ставіцца да сваёй гісторыі? Разумею, што кіраўнікам гміны справа можа быць невядомая. Але ад чаго маем радных?

Абагульняючы вышэйсказанае спадзяюся, што самаўрад станоўча паставіцца да прад'яўленай праблемы і паклапоціцца пра запушчаную магілу.

Сабачая праблема

Пра бяздомных сабак неаднойчы пісала „Ніва". Справа тычыцца бадзяжных чатырохногіх жывёл па нашых вёсках і мястэчках. Ніхто імі не цікавіцца, ні гаспадары, ні мясцовыя самаўрады. Такое сустракаем не толькі ў Чаромхаўскай гміне, але ва ўсёй краіне.

Перыядычна праводзіцца вакцынацыя сабак супраць шаленства. З таго, што мне вядома, самаўрады, расклейваючы абвесткі, інфармуюць уладальнікаў жывёл аб тэрміне і месцы вакцынацыі. У Кузаве сёлета акцыя праходзіла ў пачатках кастрычніка ў двух пунктах: пры вясковай краме і на пачатку вёскі з боку чыгуначнай станцыі. Гаспадары абавязаны былі прывесці сабак у назначаны час, прычым заплаціць ветэрынару належныя дваццаць злотых за ўкол. Калі хтосьці папрасіў лекара зрабіць прышчэпку на сваёй сядзібе, дык трэба было заплаціць дадатковыя пяць злотых за даезд. Ці так быць павінна? Варта прыкмеціць, што ў час вакцынацыі свіней лекар паслугу выконвае ў гаспадарскай забудове і не патрабуе дадатковай аплаты за даезд. Чаму затым у выпадку сабак лекары паступаюць інакш?

І яшчэ адно. У выпадку вакцынацыі сабак супраць шаленства ветэрынар (па-мойму) абавязаны ў прысутнасці гаспадара адкрыць свежую прышчэпку і даць укол звярыне. А гэтага не прыкмячаецца. Можна канстатаваць, што лекар адным шпрыцам „афармляе" ўсіх кліентаў. Ці гэта не пагражае перамяшчэнню хваробы з хворай звярыны (калі такая трапіцца) на здаровую?

І справа апошняя. Які закон абавязвае (у выпадках добраахвотнасці) уладальніка сабакі прывесці звярыну для прышчэпкі супраць шаленства ў назначаны пункт? А мо гэта выдумка ветэрынараў дзеля сваёй выгады?

(ус)

Маэстра ў клубе „АБ-БА"

Вядучым сустрэчу з Маргарытай Дмітрук быў тэлежурналіст Мікола Ваўранюк

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

— Напэўна Падляшскі край для мяне важны. Здзіўляюся маім студэнтам, што хочуць паехаць, напрыклад, аж у Мексіку, каб зрабіць дыплом, — сказала ў час чарговай дыскусійнай сустрэчы ў клубе Згуртавання бацькоў дзяцей вывучаючых беларускую мову „АБ-БА", прызнаная таксама за межамі Польшчы мастачка Маргарыта Дмітрук, свядомая беларуска, народжананая ў Бельску-Падляшскім.

Як звычайна так і гэтае спатканне адбылося ў пятніцу 9 кастрычніка ў беластоцкай Пачатковай школе № 4. Трыццаціпяцігадовая мастачка, якая займаецца галоўным чынам літаграфіяй (рысунак у камяні вядомы ад двух стагоддзяў) і жывапісам, але і ўнікальнай тканінай (перш за ўсё шматколерныя швэдры і шкарпэткі, з разнароднымі ўзорамі) — рэдкі госць у Беластоку. Штодзень пані дактарантка Дмітрук з'яўляецца выкладчыцай у варшаўскай Акадэміі мастацтваў. Таму ўдзельнікі сустрэчы („свядомыя беларусы, якім шмат у чым абавязана") мелі да яе шмат пытанняў. Вядучы сустрэчу тэлежурналіст Мікола Ваўранюк пачаў ад думкі, выказванай некаторымі, што частку яе прац параўноўваюць да работ Марка Шагала, а яе самую называюць унучкай гэтага маэстра з Віцебска. Мастачка баранілася:

— Я ўцякаю ад гэтай этыкеткі ўвесь час.

Пасля ўспамінала аб цяжкай працы, якой з'яўляецца літаграфія:

— Кожная з іх займае мне каля двух тыдняў. Раблю іх уручную, а чалавек гэта не машына.

Прагучала пытанне, адкуль у яе працах часта паяўляецца элемент смерці:

— Трэба было хутка дарасці. Зарана і зашмат здарылася ў маім жыцці: заўчасная смерць майго бацькі, калі мне было дванаццаць гадоў, пасля розныя трагедыі маіх сяброў. Трэба было паглядзець на жыццё інакш, і гэта ўва мне засталося.

Пыталіся мы ў яе пра працу са студэнтамі АМ:

— З шасцідзесяці студэнтаў ледзь пяцёх вылучаецца. Не магу ўсіх укідваць у адзін мяшок. Спрабую з кожнага выцягнуць тое, што ў ім найкаштоўнае і накіроўваць у той бок, які яго цікавіць.

Пасля, у сувязі і з гэтым матывам, спаслалася:

— Стараюся быць сабой. Гэта рэцэпт для ўсіх маладых: рабіць як думаеш і адчуваеш, нікога не капіраваць, быць сапраўдным.

Яшчэ ў пачатковай школе хацела — як гэта гаворыцца — займацца музыкай. Аднак...:

— У другім класе беларускага ліцэя рашыла я, што пайду ў Акадэмію мастацтваў. Штотыдзень ездзіла да Лёніка [Лявона Тарасэвіча — М. Х.] і ён ацаняў мае працы. Акадэмія мастацтваў у Мінску гэта быў свядомы выбар, выбар свядомай беларускі.

Канчаткова яна выпускніца факультэта графікі АМ у Варшаве. Дыплом з вылучэннем у 1999 г. атрымала ў майстэрні праф. Владыслава Вінецкага; анекс жывапісу ў майстэрні праф. Адама Стыкі.

Аліна Ваўранюк са Згуртавання „АБ-БА" ўспомніла, з чым згодныя былі іншыя ўдзельнікі клубнай сустрэчы:

— У тваіх працах, якія я бачыла, відаць, што ты — дачка якраз гэтай зямлі.

Хтось кінуў:

— А ты хацела б сюды „вярнуцца"?

— Але ж я адчуваю, што быццам бы згэтуль ніколі не выязджала. На жаль, шмат людзей, якіх ведаю, увогуле не памятаюць адкуль яны.

Сціплая, памяркоўная, як заўсёды з усмешкай, быццам мадонна з карцін ренесансных мастакоў, Маргарыта Дмітрук сказала толькі:

— Думаю, што гэта добра!

У пэўны момант адзначыла:

— Найлепш не думаць аб поспеху і кар'еры. Найлепш жыць і працаваць. Праца, праца і паслядоўнасць. Яны даюць найбольш рэзультатаў.

Прытым дадала:

— Калі хтось кончыць Акадэмію, не мусіць значыць, што ён мастак.

Мастачка паказала арыгіналы з некалькіх цыклаў, між іншым славутага „Тутэйшыя". Паказвае ў ім, быццам спыненыя на плёнцы мультыплікацыйнага фільма кадры з жыцця бабулі і дзядулі:

— Пражылі яны разам 62 гады і заўсёды вельмі дбалі адно аб адно.

Іншы цыкл: „Камбінат", гэта запіс сустрэч з яе маэстра з Мінска Дзмітрыем Малатковым, да якога хадзіла на прыватныя заняткі ў час сваёй адукацыі ў мінскай Акадэміі мастацтваў (афіцыйна нельга было ёй як студэнтцы):

— Я хацела, каб было тут відаць шмат дэталяў: яго ногі, рукі (...). Малаткоў ад пяцідзесяці гадоў працуе ад рання да вечара. Гэта чалавек вельмі вясёлы. Я не адчувала розніцы ва ўзросце паміж намі, каля сарака гадоў. Паміж намі было ідэальнае паразуменне.

Аб адной з прац з цыкла „Фэст":

— Памятаю яшчэ як у Бельску на вуліцы коні міналіся з самаходамі.

Аб сваёй бабулі, якой прысвяціла цыкл „Паніхіда":

— Была яна мудрым чалавекам са сваімі прынцыпамі і каштоўнасцямі, іначай чым сённяшні свет, хоць не ўкідваю ўсіх у адзін мяшок. Малілася бесперапынна: за ўнукаў, за ўсіх, перад абедам, пасля абеду. Думаю, што гэта вельмі каштоўнае, што ёсць такія людзі, як мая бабуля, якія ўвесь час моляцца за ўсіх.

Анатоль Вап, дырэктар дэпартамента культуры і нацыянальнай спадчыны Маршалкоўскай управы сказаў, паглядзеўшы „Паніхіду":

— Смерць гэта сур'ёзная справа. Трэба да яе падрыхтавацца.

Маргарыта Дмітрук:

— Я падыходжу да яе нармальна.

Пад канец сустрэчы паказаны былі фільмавыя анімацыі мастачкі з музыкай, ды здымкі Дарыюша Павэльца м.інш. яе швэдраў:

— Раблю іх з нітак швэдраў шмат якіх людзей.

Уражанне выклікаў асабліва швэдар „прыкрываючы" надмагільны помнік на могільніку ў Дубічах-Царкоўных, у блакітных колерах, упісваючыхся колерам у іншыя крыжы.

У адным з каталогаў, выдадзеным з нагоды мінулагодніх выставак у Познані і Варшаве, якія маглі паглядзець госці дыскусійнага клуба згуртавання „АБ-БА", Малгажата Віхаркевіч напісала: „Перш за ўсё блакіт вобразу Маргарыты Дмітрук нас азарае. Гэта не толькі райскасць і благадаць. Ёсць штодзённасць. Штодзённасць перанесеная блакітам. Неварагодная светлыня і інтэнсіўнасць колеру. І адчуванне таямніцы. Гэта карціна для сузірання".

Гульня ў вайну

Кім была б ты ў 1943 годзе, зразумела, каб магла ўвогуле тады жыць? А ты? На якім баку хацеў бы стаяць? А вы?.. Я хацела б стаяць па баку жыцця. Не ведаю толькі ці дазволілі б, ці быў бы такі шанц, уклад сіл, сітуацыі, лёс ці нейкая добрая карма. А найлепш тады не жыць увогуле, лепш не нарадзіцца. А што з тымі, якія не мелі выбару? Частка пражыла, іншыя пажыць не паспелі. На гэтым завяршаецца мая ахвота пазнаваць ваенны час. Уваходзіць у скуру адных ці другіх мне не вельмі хочацца. Узровень нялюдскасці, ды наадварот, узровень людскасці ў ваенны час можа нават перарастае маё разуменне чалавечнасці. Прызнаю, аглядала я ваенныя фільмы, чытала кніжкі, у якіх жыццё герояў парадкавала вайна. Немагчыма сёння не разумець, што войны былі, ёсць і будуць і можа таму таксама ёсць і людзі, якія пра іх хочуць ведаць шмат, а нават больш. Кніжак ім недастаткова. Патрабуюць стаць часткай тадышняй атмасферы, хутчэй нават сказаць — лёсу. Жудаснага лёсу.

Восеньскі ўік-энд. Першыя адчувальныя халады. Аддаленае, глухое месца, два рэканструяваныя будынкі ды дэкор дакладна такі як у саракавыя гады. Гэта клімат схаванага дзесці ў Пастаўскім раёне „хазяйства", дзе група людзей з сарака асоб прыехала згуляць між іншым лёс сваіх дзядоў.

— Гэтае месца таксама было пад акупацыяй і сітуацыя, якую мы адыгрывалі, была актуальная таксама для гэтых зямель, — пераконвае Алёна. — І „амонаўцы", і КГБ нас наведвалі, не ведаю ці аб гэтым варта пісаць. Казалі, што ім грыбнікі патэлефанавалі, але мне не верыцца. Нямецкіх жаўнераў адыгрывалі некалькі хлопцаў, якія дзейнічаюць у клубе гістарычнай рэканструкцыі. Яны маюць дазвол на зброю і касцюмы, таму такія візіты абышліся без праблемаў.

У Польшчы групы гістарычнай рэканструкцыі зараз вельмі папулярныя. З нагоды сямідзесятай гадавіны выбуху II сусветнай вайны сёлета па цэлай краіне вяліся вялікія змаганні. У якасці прыкладу возмем бітву пад Ломжай, але адбыліся і бітва над Бзурай, і пад Млавай, і амаль усюды, дзе нейкі бой у гісторыі меў месца. Большасць гарадскіх святкаванняў, звязаных з гісторыяй Польшчы ды польскага народа, мае зараз агульны назоўнік: з'яўляюцца ім гістарычныя акцэнты ў якасці акопа з гэтай ці іншай вайны, праезду ўланаў ці маршу партызан. Ахвотных гуляць у такіх групах таксама штораз больш, а сярод іх, між іншым, інжынеры, дырэктары, кіраўнікі, доктары. Не скажу ўжо нават пра Грунвальд, які праз год будзе адзначаць сваё 600-годдзе. Там напэўна прыедзе найбольш беларускіх ваяроў, бо якраз сярэднявечных фармацый у Беларусі шмат. Гэта аднак не адзіныя спосабы сучаснага адчування гісторыі.

LARP (ang. live action role-playing) — від фабульнай гульні, якая праводзіцца ў перасечанай мясцовасці, нешта ў родзе імправізаванай тэатральнай пастаноўкі.

— Мы так звычайна не рэканструюем гістарычных падзей, ідзе пра нешта іншае. Кранаем жыццё звычайнага чалавека ў ваенных абставінах, — тлумачыць Алёна Вялічка, якая прадстаўляе адзін з адукацыйных цэнтраў па выкарыстанні нефармальных метадаў адукацыі дарослых. — У мінулым годзе мы рэалізавалі праект „Трэцяя праўда" — гульня ў кшталце ЛАРП была толькі часткай праекта, але аказалася, што паўтарыць яе стала нашай неабходнасцю, у асноўным з-за просьбаў удзельнікаў.

„Трэцяя праўда" — гэта праўда цывільных, якія ў вайне прымаць удзел мусілі. Не даў ім ніхто выбару.

— Такія гісторыі, расказы мы адшуквалі ў розных месцах. Кніжныя крыніцы ў нас наогул аднабаковыя, таму карысталіся дапамогай кансультантаў, ведамі з непасрэдных расказаў. З удзельнікамі быў у нас таксама дагавор перад гульнёй — пагутарыць са сваімі дзядамі, іх суседзямі, карацей, з тымі, якія застаюцца сведкамі ваеннага жыцця, — працягвае Алёна. — Дзякуючы гэтаму нашы „акцёры" ангажаваліся яшчэ да гульні, а сабраная інфармацыя дапамагла ім увайсці ў ролю.

Уявіце сабе зараз, што пападаеце ў беларускую вёску 1943 года. На тры дні прымаеце імя і прозвішча аднаго з яе жыхароў. З гэтага моманту забываеце пра сваё папярэдняе жыццё, гаворыце толькі на тадышнія тэмы. Мужчыны становяцца вясковымі паліцыянтамі, немцамі, савецкімі партызанамі або партызанамі АК. Ёсць таксама жанчыны.

— Жанчына ў той час была зняволенай, немцы маглі рабіць усё, што захочуць, а цябе можна было абразіць у любы спосаб і ты не магла нічога з гэтым зрабіць. Ты адчувала таксама як гэта жыць без мужчын. А мужчына? Адчуваў сапраўды рэальны страх, калі ў вёсцы стаяць немцы, пагражаюць вісельніцай тваёй сям'і, ты ў халодным, страшным лесе, а начальства кажа, што нельга рызыкаваць атрадам, — Алёна Вялічка распавядае пра запісанае ў сцэнарыі, абгрунтаванае фактамі жыццё беларускай вёскі ў 1943 годзе. — Стараліся, каб гэты сцэнарый быў насычаны падзеямі і шматлікімі складанымі сітуацыямі, напрыклад, адносіны між праваслаўнымі і каталікамі, спосабы вывабіць партызан з лесу. Наша гульня дазваляе гэта ўсё пачуць, перажыць.

Зразумець — дадам я.

„Самае галоўнае, што ўзнікла магчымасць увайсці ў галаву другога чалавека. Столькі разоў хочацца ведаць як павёў бы сябе іншы, не я. Здаецца, гэта немагчыма, але „немагчымае стала магчымым" дзякуючы менавіта гульні. Можна экзаменаваць самога сябе, акрэсленую частку пражыць пад маскай, задумацца над магчымымі дзеяннямі чалавека, але таксама ажыццявіць іх без усялякіх тэарэтычных перадумоваў, у гэтым жа соль. Галоўнае — не забыцца і не загуляцца", — Маша.

— Ёсць у нашай гульні гэтак званы „стоп". Калі нехта адчувае, што не вытрывае ў сваёй ролі, калі адчувае вялікі цяжар падзей, калі яго псіхіка, здаецца, не пераадолее да канца сітуацыі, можа сказаць „стоп". Яго роля, удзел спыніцца, — працягвае Алёна. — Было пару асоб, якія мелі „стоп" ужо амаль на вуснах. Але пратрымаліся. Пасля былі задаволены больш чым іншыя, менавіта таму, што вытрымалі ў найцяжэйшы момант.

„Мяркую што [мяне] гульня не [змяніла], мажліва таму, што я альбо дастаткова ведаў пра вайну, альбо дзеянні гульцоў супалі з маімі ўяўленнямі. Пэўны час пасля гульні была дэпрэсія, бо ўсвядоміў усю цяжкасць таго становішча, у якім апынуліся людзі. Гульня выклікала роспач ад безвыходнасці, у якой апынуліся людзі [у час вайны]", — Андрусь.

Толькі дзякуючы такой гульні, паводле яе ўдзельнікаў, магчыма рэальна пабачыць свет, які раней быў незразумелы. Можна зразумець хаця б таксама, чаму закаханы „эсэсман" не можа забраць з сабой у Нямеччыну славянку.

— Але нам пашанцавала з гэтымі немцамі, — дадае Алёна. — Зразумела, не ў кожны момант, але, паводле расказаў, часцей за ўсё немцы былі добрыя, памагалі ў вёсках. У 1943 годзе яшчэ так не „зверствавалі", таму таксама лягчэй было ўвайсці ў ролю акупанта. Нягледзячы на гэта ты пазбаўлены правоў, як асенні ліст, і калі не дастасоўваешся — расстраляюць або ў карцэр пасадзяць. Пасля такой гульні больш цэніш сваё сучаснае месца ў жыцці. Асабліва жанчынам сёння лягчэй жывецца.

Гэты канкрэтны ЛАРП мае яшчэ адно важнае вымярэнне.

— Прынцыпам была беларуская мова, — натуральна працягвае арганізатарка. — У кожнага ўдзельніка была гэтая свядомасць і ўсе дастасоўваліся без праблемаў. Мушу прызнаць, што пасля гульні ў большасці палепшыўся ўзровень беларускай мовы. Адкуль такая перадумова? Тады, у час вайны, не было тут рускай мовы. Сёння, на жаль, па-іншаму. Шкада. У агульным плане наша гульня вельмі ідэйная.

Ілона КАРПЮК

Медаль рэктару Падляшскай акадэміі

Рэктар Падляшскай акадэміі ў Седльцах праф. Антоні Юўка ўзнагароджаны медалём „За заслугі для Гродзенскага ўніверсітэта". Узнагарода была ўрачыста прысвоена 2 кастрычніка рэктарам Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы праф. Яўгенам Роўбам. Урачыстасць была прымеркавана да інаўгурацыі чарговага акадэмічнага года ў Седльцах. Падкрэсліла яна рангу узнагароды, тым больш што ў ліку гасцей былі І сакратар Пасольства Беларусі Дзмітры Выбарны і Аліна Чарняўская з Генконсульства РП у Гродне. Праф. Яўген Роўба адзначыў ангажаванасць праф. Антонія Юўкі ў супрацоўніцтва паміж абедзвюма навучальнымі ўстановамі, якая працягваецца ўжо восем гадоў. За гэты час праводзіліся супольныя даследаванні, абмен супрацоўнікамі, ладзіліся канферэнцыі, амаль 200 студэнтаў з Гродна пабывала на практыках у Седльцах.

Праф. Яўген Роўба (злева) уручае медаль „За заслугі для Гродзенскага ўніверсітэта" праф. Антонію Юўку

Як паведаміў прэс-сакратар Падляшскай акадэміі д-р Адам Бобрык, у школе студэнты могуць навучацца на 17 спецыяльнасцях. У акадэміі вучыцца 10 500 чалавек, у тым ліку 3500 на першым курсе. Сярод студэнцкай моладзі маецца 21 грамадзянін Беларусі. Заняткі са студэнтамі праводзяць 623 выкладчыкі, у тым ліку 156 прафесараў. Аб добрых выніках навучання сведчыць факт, што ў мінулым годзе 1690 студэнтаў атрымалі навуковую стыпендыю, а 9 чалавек сталі стыпендыятамі Міністэрства навукі.

Важным аспектам з'яўляецца таксама даследчыцкая дзейнасць. Рэалізуецца тут каля 400 даследчыцкіх тэм, 14 грантаў, у мінулым годзе супрацоўнікі выдалі 1600 навуковых публікацый (у тым ліку частку на Беларусі), атрымалі 7 патэнтаў, сарганізавалі 23 канферэнцыі. Студэнты актыўна ўдзельнічаюць не толькі ў абавязковых заняткаx, але таксама займаюцца ў 29 навуковых гуртках, у рамках якіх маюць яны магчымасць весці даследчыцкую дзейнасць і публікаваць свае вынікі.

(гак)

Плебісцыт на ўчастковага

У верасні Ваяводская камендатура Паліцыі абвясціла інтэрнэтавы плебісцыт на ўчастковага. Падрабязнасці гэтай справы паясняў на спецыяльнай прэс-канферэнцыі ваяводскі камендант Ігар Парфянюк. Галасаваць будзе можна цягам двух месяцаў, пры чым з аднаго камп'ютара можна будзе перадаць адзін голас у суткі. Адначасова прытым можна ананімна запоўніць анкету, у якой апытваны пакажа свае заўвагі і прапановы ў адрас паліцыі. Плебісцыт, паводле арганізатараў, мае дапамагчы ў паляпшэнні працы ўчастковых. Зацікаўленых адсылаю на лінк: www.podlaska.policja.gov.pl/prewencja/vote/

(ус)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Ніка Паўлоўская ў рэдакцыі „Зоркі"

Аўгіння Кавалюк

Мыюцца кацяняты

Лапкай мяккай без вады
Умываюцца каты.
Мыюць вушкі і насы
І на спінцы валасы.
Так, як мамы,
Так, як таты,
Мыюцца і кацяняты.

Урок патрыятызму

— А гэта што? — Ніка дакранулася да татавай кашулькі з выявай бел-чырвона-белага сцяжка.

— Гэта беларуская фляга! — адказаў бацька.

У дзяўчынкі засмяяліся вочкі. Яна чамусьці не паверыла ў такі адказ. І тата, пабачыўшы яе недавер, дакрануўся да выявы сцяжка на кашульцы, які красаваўся на яго грудзях, і разборліва паўтарыў дачушцы:

— Гэта беларуская ф-ля-га! — і затым дадаў: — Бо я беларус, твой брат беларус і твая мама беларуска.

Тады Ніка зразумела. Яна таксама дакранулася да сваіх грудзей як тата і са здзіўленнем для сябе самой сказала:

— І я б-а-б-а руска?!

З-КА

Іван Бурсаў

Страшная казка пра страшнага звера

Здарылася гэта ў тую ноч, калі вецер на небе зоркі пагасіў, а месяц у цемначы заблудзіў. І такая цемра была тады на зямлі, такія страшныя шолахі поўзалі вакол, што нават самыя смелыя сабакі пазашываліся ў свае будкі і там ляскалі зубамі са страху.

І вось у тую самую ноч, калі гадзіннікі прабілі дванаццаць разоў, бразнула ў печы засланка і з прыпечка на падлогу скокнуў страшэнны-найстрашэнны звер. Хвост чорны, вусы чорныя, сам чорны, як галавешка, толькі вочы вугольчыкамі свецяцца.

Павёў страшны звер вусамі чорнымі, тройчы ўдарыў аб падлогу чорным хвастом, — пачаў кіпцюры вастрыць.

Вастрыў-вастрыў, ды раптам я-а-а-к скочыць у самы далёкі кут! Хацеў страшны звер начны шолах за хвост злавіць, ды ў цемры не разлічыў, наляцеў ілбом на старую, што не адзін падворак выхадзіла, бярозавую мятлу

Спалохалася старая бярозавая мятла страшнага звера, хацела ў двор уцякаць, ды адзіная нага са страху адзервянела. Падскочыла старая мятла на адным месцы і грымнулася проста на паліцу з посудам.

Спалохалася паліца з посудам, спрасонку хацела на падлогу саскочыць, ды ўспомніла, што яна да сцяны трывала цвікамі прыбітая. Затрэслася паліца са страху, ды так моцна, што ўвесь посуд, які начаваў на ёй, разбудзіла.

Прачнуліся кубкі і міскі, з перапуду пачалі штурхацца, адзін за аднаго хавацца. Штурхаліся-штурхаліся дый спіхнулі з паліцы самы маленькі кубачак.

Упаў кубачак і — проста страшнаму зверу на спіну.

Як падскочыць страшны звер на адным месцы ды як закрычыць на ўсю хацінку страшным голасам:

— Мя-я-ў-ў!!!

Прачнуўся на печы дзед — бяда-не-бяда, ільняная барада. Злавіў ён страшнага звера, адчыніў акно ды вытурыў яго проста ў цёмную-найцёмную ноч, прымаўляючы:

— Досыць табе, кот, хвост задзіраць ды ўнукам спаць не даваць, малако са збанка піць ды посуд біць... Ідзі-ткі ты лепей па двары прагуляйся!

А ў гэты час месяц знайшоўся, над страхой хацінкі засерабрыўся. Пеўні крыламі залопалі і казку спалохалі...

Усё!..

Локніца

На падляшскай зямлі шмат малых, але вельмі чароўных вёсак. Распалажаныя крышку з боку ад гаманлівых шашэй і дарог, жывуць яны сваім спакойным жыццём. Так як хаця б Локніца.

Фота Аляксандра Вярбіцкага

Вуліца ў Локніцы

Назва вёскі выводзіцца ад пераплываючай непадалёку аднайменнай ракі. У мінулым Локніца была духоўным цэнтрам гэтай аколіцы. Знаходзілася тут праваслаўная царква. Хаця цяпер ніякіх слядоў ад яе няма, памяць аб храме захавалася ў праверачных дакументах горада Нарвы ад 1560 г., а таксама ў традыцыі тутэйшых жыхароў. Локніцкая царква была праўдападобна разбурана ў час ваенных пажарышчаў 1655-1660 гадоў. Аб тым, як важнай магла быць Локніца ў XVII ст., можа сведчыць факт, што ў 1780 годзе ў Бельску існавала вуліца Локніцкая.

На пачатку XX ст. на рацэ Локніцы знаходзіўся невялікі вадзяны млын, якога гаспадаром быў Зыгмунт Вальферскі.

Недалёка ад Локніцы, у бок вёскі Шчыты, знаходзіўся заезны дом, у якім затрымліваліся тыя, што падарожнічалі *Царскім гасцінцам*, які праходзіў непадалёк вёскі. Сёння аднак ад яго не асталося ніякіх слядоў.

У 1915 годзе, у час бежанства, жыхары Локніцы эвакуіраваліся даволі позна, дзякуючы чаму іх вярнулі немцы і яны не выехалі ў глыб Расіі. Вёску перад спаленнем казакамі выратаваў цясляр Ян Пракапюк.

Побач вёскі знаходзяцца, фрагментарна захаваныя, халерычныя могілкі з XIX стагоддзя. Узніклі яны праўдападобна ў час эпідэміі халеры ў 1831 годзе. Паводле легенды, каб вызваліцца ад знішчальнай эпідэміі, жыхарам вёскі на працягу адной ночы трэба было пабудаваць крыж і выткаць палатно. Абвязаны палатном крыж укапалі на ростанях. Да нашага часу гэты крыж не захаваўся.

Адным з цікавейшых элементаў тапаграфіі гэтага раёна з'яўляецца несумненна найвышэйшы вышынны пункт — 155,3 м н.у.м., які знаходзіцца на тэрыторыі, званай *Груд*.

У Локніцы даўжэйшы час дзейнічала чатырохкласная падставовая школа. Аднак закрылі яе ў 1975 годзе.

Міхась СЦЕПАНЮК

Каб маглі развіваць зацікаўленні

Стыпендыяткі (злева): Аксана Федарук (Бельскі белліцэй), Аліцыя Міранчук (Медычны ўніверсітэт у Беластоку, яна лаўрэатка I месца алімпіяды па рускай мове), Іаанна Герасімюк (Гайнаўскі беліцэй), Наталля Кандрацюк-Свярубская (Агульнаадукацыйны ліцэй № 3 у Беластоку), Магдалена Саковіч (Агульнаадукацыйны ліцэй № 4 у Беластоку), віцэ-маршалак Яцак Пярунак, Аляксандра Каліна (Агульнаадукацыйны ліцэй № 3 у Беластоку), Аляксандра Кірылюк (Гімназія № 6 у Гайнаўцы), Эдыта Маркевіч (Бельскі белліцэй)

— Вы цвет і будучыня нашага ваяводства, — назваў сёлетніх стыпендыятаў падляшскі маршалак Яраслаў Дважанскі.

Сустрэча са стыпендыятамі Падляшскай маршалкоўскай управы на навучальны 2009/2010 год адбылася 9 кастрычніка г.г. у беластоцкім палацы Браніцкіх. У бягучым годзе паступіла за 600 прашэнняў на навуковыя стыпендыі. Аднак грашавую падтрымку атрымаў кожны дзесяты здольнік, разам 67 асоб — з гімназій, ліцэяў і першакурснікі вышэйшых навучальных устаноў (апрача поспехаў у прадметных конкурсах трэба мець сярэднюю ацэнку не меншую за 4,00 балы). На фоне рэгіёна вылучаліся бельскія і гайнаўскія ліцэі з беларускай мовай навучання, а таксама беластоцкі ліцэй № 3. Тут спрацавалі конкурсы па беларускай мове — у ліку стыпендыятаў вылучылі аж сем лаўрэатаў алімпіяды па беларускай мове. Некаторыя з іх, як гімназістка Аня Кірылюк з Гайнаўкі, лаўрэатка па беларускай і польскай мовах.

— Мы, як усе цывілізаваныя народы, разумеем сэнс інтэлектуальнага развіцця моладзі, — гаварыў маршалак. — Мы верым, што гэтыя сродкі спрацуюць у будучыні. Яшчэ гэтай восені Управа выходзіць з дадатковай праграмай і назначыць яшчэ 200 стыпендый здольнай моладзі. Мэта стыпендыі не сацыяльная, яна ў галоўным павінна развіваць зацікаўленні.

Паколькі стыпендыятаў па беларускай мове складалі самыя дзяўчаткі, яны сапраўды выглядалі як цвет і аздоба мерапрыемства. Бо сярод здольнікаў па ўсіх іншых прадметах, нават тых гуманістычных, рашуча пераважаў „брыдкі" пол.

ЗОРКА
Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Глеб Лабадзенка

* * *

па рэйках
тонкіх —
жылках клёну —
сцякае восень да мяне
я летні
гойсаны
зялёны
цябе малюю
на акне
я для сваіх
дзівосных мараў
запалкавы
будую дом
цябе малюю
на абшары
раблюся
казачным катом
ты
як сняжынка
панавееш
і новай рыскай
далягляд
вяртаеш
тысячнай завеяй
сябе рыхтуеш
да каляд

Музыка з кайфам

Ад Мельніка да Гомеля

Набліжаецца чарговы, шаснаццаты выпуск фестывалю „Бардаўская восень" (23-25 кастрычніка 2009, www.sonca.org). Гэта добры момант, каб у „Музыцы з кайфам" успомніць бардаўскія постаці.

Адной з важнейшых асоб у бардаўскім беларускім свеце з'яўляецца Андрэй Мельнікаў. Наведвальнікі бельскага фестывалю сустракалі яго неаднойчы, але па шчырасці, няшмат пра яго ведаем. А нарадзіўся ён у Берасцейскай вобласці, але жыве ў Гомелі. Там працуе вартаўніком у адной з бібліятэк, хаця па адукацыі ён беларускі філолаг і настаўнік. Як сказаў ён у адным інтэрв'ю, не наракае на такую прафесію, паколькі дае яна яму магчымасць адводзіць шмат часу на творчасць і сустрэчы з людзьмі. Вельмі важныя для яго гісторыя і хрысціянства. З гістарычным планам звязана між іншым яго рэгулярная прысутнасць на бардаўскім фэсце на полі Аршанскай бітвы 1514 года. Шмат яго песень распавядае пра гістарычныя падзеі, гістарычныя постаці, паказвае таксама стаўленне аўтара да іх. Калі ідзе пра хрысціянства, то яно для Андрэя Мельнікава з'яўляецца галоўнай сістэмай і зборам каштоўнасцей, паводле якіх стараецца жыць. Яго падыход да веры мяняўся з гадамі. Першая ягоная песня ўзнікла ў 1982 годзе і па сваім характары, як пішуць крытыкі, была даволі іранічна-рэлігійнай. Зараз Андрэй Мельнікаў вельмі часта выступае на хрысціянскіх мерапрыемствах. Нават мне давялося яго паслухаць у час каталіцкіх Каляд год таму на канцэрце ў славутым Чырвоным касцёле ў Мінску. У яго выкананнях сапраўды адчуваецца перапоўнены верай, надзеяй і любоўю настрой.

Андрэй Мельнікаў — плённы мастак. Запісаў ён больш за дзесяць альбомаў. Яго адметнасць вызначае таксама спецыфічны алфавіт, якім запісвае свае песні і падпісвае альбомы. Характэрны яму таксама гук трубы, які плыве з вуснаў спевака, хаця, як сам гаварыў у інтэрв'ю, хочацца рабіць увесь час нешта больш дасканалае, таму падымаў спробы запісаў і выступаў з гуртамі „Colorado beatles" ці „Кальян". Няшмат у свеце так цікавых і чакаючых адкрыцця постацей.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 42

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 38:
Збор, замова, журавель, бакара, ар, гул, віры, прымак, ара. Зубр, мара, вы, Максім, мова, вершык, зала, гра, рыбалка.



Стараецца цэнтр беларускай культуры

Размова з **Ігарам ЛУКАШУКОМ** *— намеснікам старшыні Звязу беларускай моладзі, каардынатарам праекта стварэння Цэнтра адукацыі і прамоцыі беларускай культуры „Шчыты".*

— Звяз беларускай моладзі рашыўся выкарыстаць пустуючы будынак былой школы ў Шчытах для беларускай справы. Вядома, што хочаце адрамантаваць гэты мураваны будынак і стварыць у ім Цэнтр адукацыі і прамоцыі беларускай культуры „Шчыты". Нядаўна гэты будынак быў вамі адкуплены ад гміннага самаўрада.

— Адкупілі мы школьны будынак за 10% яго вартасці, на што мелі згоду арлянскай Гміннай рады. Заплацілі мы звыш 17 тысяч злотых і ў адпаведнасці з натарыуснай пастановай летам гэтага года сталі ўласнікамі будынка.

— Вы раней заяўлялі, што за сродкі на куплю і рамонт будынка будзеце выступаць у Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі. Як з гэтым атрымалася?

— Напісалі мы праект, які прадбачваў куплю будынка і яго рамонт, які забяспечваў бы перад нішчэннем маёмасць і атрымалі на гэты год з Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі 80 тысяч злотых. Прадбачваем уступна, што на падрыхтоўку экспертызаў, дакументацыі, завяршэнне ўсіх рамонтных работ у будынку і падрыхтаванне акружаючай яго плошчы да выкарыстання згодна з нашымі меркаваннямі трэба будзе выдаткаваць 800 тысяч злотых. Калі б атрымлівалі на нашы праекты сродкі з МУСіА, трэба будзе выдаткаваць таксама мінімум 10% ад гэтай сумы ўласных сродкаў, гэта значыць каля 80 тысяч злотых. Таму і звяртаемся з заклікам да ўсіх, якім наша ініцыятыва неабыякавая і хто хоча нам дапамагчы, уключыцца ў супрацоўніцтва падчас стварання нашага Цэнтра. Патрэбныя будуць нам уласныя сродкі, будаўнічыя матэрыялы і людзі да працы. Будзем звяртацца таксама за дапамогай па-за МУСіА, у розныя фонды. Больш інфармацыі можна будзе знайсці на нашай інтэрнэтнай старонцы **www.szczyty.sonca.org**, якая яшчэ толькі ствараецца. Будзем на ёй паведамляць аб тым, што мы ўжо зрабілі і што плануем рабіць у бліжэйшы час.

— Напэўна ў бліжэйшы час трэба будзе забяспечыць пустуючы будынак.

— У час рэалізацыі першага этапу нашага праекта да канца гэтага года хочам яшчэ абгарадзіць частку плошчы і памяняць частку вокнаў, бо яны вельмі моцна знішчаны, а ў многіх месцах павырываны. Проста хочам забяспечыць будынак, каб ён не руйнаваўся. Добра, што дах, які прыкрыты бляхай, а па ёй шыферам, не працякае. У наступным годзе хочам адрамантаваць адну вялікую залу, каб ужо можна было арганізаваць у ёй мерапрыемствы.

— Калі ў перспектыве чарговых гадоў бачыце магчымасць завяршэння ўсіх рамонтных работ, каб можна было поўнасцю здаць будынак у карыстанне?

— Прадбачваем рамонтныя працы недзе на тры гады, але гэта будзе залежаць ад нашых фінансавых магчымасцей.

— Для Беларускага цэнтра вы выбралі зручнае і прыгожае месца.

— Так, наш цэнтр будзе распаложаны побач ваяводскай дарогі Бельск-Падляшскі — Гайнаўка і па дарозе ў Белавежу. Гэта месца на сутыкненні трох гмін: Арлянскай, Бельскай і Чыжоўскай. Школьны будынак знаходзіцца таксама ў прыгожым месцы, побач прыгожай, даўняй царквы і крыху аддзелены ад гаспадарчых будынкаў і людскіх сядзіб.

Фота Аляксея МАРОЗА

— Раней вы інфармавалі, што хочаце выкарыстаць пустуючы будынак перш за ўсё для патрэб маладых людзей і арганізаваць у ім вясковую святліцу.

— Самае важнае, каб стварыць цэнтр, у якім будзе весціся праца з дзеткамі і моладдзю ў напрамку беларускай культуры і шматкультурнасці. У Арлянскай гміне побач беларусаў жылі ж палякі і многа жыдоў. Мы хочам, каб у цэнтры заняткі ладзіліся не толькі для беларускіх дзетак і моладзі, але і для палякаў, якія павінны мець магчымасць знаёміцца з мясцовай культурай. У нашым асяродку павінен весціся польска-беларускі дыялог. Можна будзе гэта ладзіць у рамках зялёнай школы, бо і такую арганізацыю працы прадбачваем у нашым цэнтры. Побач адукацыйных праграм плануем ладзіць у нашым асяродку выстаўкі, сустрэчы, канцэрты і арганізаваць цэнтр культурна-турыстычнай інфармацыі, бо ў нашым рэгіёне не хапае перш за ўсё звестак пра пражываючых тут беларусаў і пра нашу культуру. У Шчытах і побач іх праходзяць жа культурна-турыстычныя шляхі „Царскі гасцінец" ды „Дрэва і сакрум". Дзяды і прадзеды сённяшняй шчытоўскай моладзі будавалі школьны будынак і таму хочам таксама арганізаваць у нашым цэнтры вясковую святліцу, у якой маглі б ладзіцца сходы і іншыя грамадскія сустрэчы для мясцовага насельніцтва. Лічым, што наша ідэя будзе яднаць наша асяроддзе, а наш цэнтр будзе патрэбны не толькі цэлай нашай беларускай меншасці, але і ўсяму нашаму мясцоваму насельніцтву.

Фота Аляксея МАРОЗА

Шчытоўская школа, якая зараз яшчэ пустуе, мае хутка набраць бляску і шыкарнасці

— Нядаўна ў Нарве была наладжана выстаўка фотаздымкаў „Падляшша невядомае", выкананых у час першага этапу рэалізацыі вамі праекта Падляшскі культурны шлях „Дрэва і сакрум". Што да гэтай пары ўдалося зрабіць у рамках гэтага праекта?

— У час сёлетняй нашай пабыўкі ў Нарве мы збіралі матэрыял для рэалізацыі другога этапу нашага праекта. Цяпер адбываецца яго апрацоўка і рэдакцыя тэкстаў. У другім этапе прадбачваем устанавіць стэнды з Чыжоў у напрамку Нарвы і з Парцава на Рыбалы. Шлях гэты будзе спалучацца ў наднарваўскіх вёсках і закрыецца ён кругам. Будзем таксама выдаваць кніжачку пра другі этап шляху, а ў наступным годзе адбудзецца яго адкрыццё.

— Якія ў вас планы наконт рэалізацыі праекта „Дрэва і сакрум" у будучыні?

— Праект „Дрэва і сакрум" рэалізуе Маршалкоўская ўправа, а ЗБМ быў толькі выканаўцам гэтага праекта. Аднак прадугледжваецца, што шлях пойдзе на поўнач у напрамку Нараўкі, Міхалова і Гарадка, а пазней на поўдзень ад Дубіч-Царкоўных туды, дзе захавалася многа драўлянай архітэктуры.

— Ужо хутка будзе ладзіцца XVI Фестываль беларускай бардаўскай ды аўтарскай песні „Бардаўская восень". Што адметнага будзе ў гэтым годзе?

— Фестываль „Бардаўская восень" будзе праходзіць з 23 да 25 кастрычніка і, паколькі гэта не юбілейнае мерапрыемства, будуць ладзіцца ў час яго конкурсныя праслухванні. Новым будзе вялікі канцэрт у Беластоку па-за студыяй у Радыё Беласток. Апрача Бельска-Падляшскага, Беластока і Гайнаўкі прадбачваем таксама канцэрты ў іншых мясцовасцях.

— Праект ЗБМ „Афіша.org" знайшоў прызнанне ў беларускіх арганізацый, якія змяшчаюць на сайце www.afisza.org інфармацыю аб сваіх мерапрыемствах. Ці многа людзей заглядае на ваш сайт, каб даведацца аб беларускіх імпрэзах або мерапрыемствах, якія толькі часткова тычацца беларускага асяроддзя?

— На працягу месяца наведвальнікі ўваходзяць на нашу старонку 2,5—3 тысячы разоў. Гэта добры паказчык і ён вельмі нас цешыць. Ставяцца ж на нашай старонцы многія інфармацыі аб падзеях у нашым рэгіёне і ва ўсёй Польшчы, спалучаныя ў нейкі спосаб з дзейнасцю беларускай меншасці. Мы запрашаем таксама ўсе нашы гміны далучыцца да нашага праекта, каб ладжаныя імі культурныя мерапрыемствы былі праз нашу старонку вядомыя для ўсяго нашага насельніцтва.

— Дзякую за гутарку.

Размаўляў Аляксей МАРОЗ

Нам дапаможная беларуская мова

У вёсках паўднёва-ўсходняй Беласточчыны сярод маладога пакалення хуткімі тэмпамі выходзіць з карыстання тутэйшая (беларуская) мова; можна нават сказаць, што ўжо выйшла. Маладыя не карыстаюцца гаворкай сваіх продкаў, аднак многія ахвотна вывучаюць беларускую мову ў школах. Вялікая доля заслугі ў гэтым „Нівы" (крыху і „Часопіса"), якую чытаюць ахвотна, калі пішацца пра іх саміх, іхніх знаёмых ці мясцовасць; так дзеецца прынамсі ў Орлі. У Арлянскай гміне важным апірышчам беларускай тоеснасці насельніцтва — на месца „тутэйшай" мовы — становіцца літаратурная ў шырокім сэнсе беларуская мова. Гэта заслуга школы, гмінных улад, Гміннага асяродка культуры, у тым ліку і ладжаных апошняй установай беларускіх фэстаў. Пра гэта размова з Аннай Несцярук, дырэктарам Гміннага асяродка культуры ў Орлі.

— ***Якія перадумовы арганізацыі беларускіх фэстаў у Орлі і гміне?***

— Заўсёды стараемся захаваць нашу традыцыю, паказваць маладому пакаленню, што мы нашай традыцыі не цураемся. Гэтымі фэстамі трымаем кантакт з Беларуссю, з тамашнімі калектывамі, каб яны да нас прыязджалі і знаёміліся з нашымі культурнымі дасягненнямі, а мы з іхнімі, каб гэтыя кантакты прадаўжаць у будучыні.

Фэсты ладзім з дапамогай Гміннай управы, трэціх асоб, спонсараў. Арганізацыя іх забірае многа часу і высілку. Войт стварае арганізацыйны камітэт і кожны ў ім за нешта адказны — за сцэну, за харчаванне, за калектывы і за парадак, за якім у нас сочаць пажарнікі-дабравольцы.

Апрача народнага беларускага фэсту ў самой Орлі (ладжанага традыцыйна ў апошнюю нядзелю канікул), на працягу цэлага года адбываюцца крыху меншыя мерапрыемствы і ў некаторых іншых вёсках гміны. У Крывятычах адбываюцца Спасаўскія запусты, ладжаныя разам з Беларускім таварыствам з Бельска-Падляшскага; сёлета, з-за рамонту крывятыцкай святліцы, імпрэза адбылася ў Кошках. Два гады таму ладзілі мы ў Малінніках юбілей дзесяцігоддзя калектыву „Малінкі". Варта адзначыць, што Спасаўскія запусты можна ладзіць у кожнай мясцовасці, аднак гэта залежыць ад мясцовай грамадскасці. Калі ў пачатку года нейкае салэцтва задэкларуе, што хоча ладзіць у сябе фэст, то ён там адбудзецца. Напрыклад, у Кошках спадарыня солтыс заангажавала ў арганізацыю мерапрыемства свае суседкі і ахвотныя для нарыхтоўкі пачастунку асобы, якія згодна насмажылі пончыкаў і занеслі ў святліцу для падсілкавання прыехаўшых калектываў.

І ўвесь час стараемся, каб ладжаныя ў нашай гміне фэсты адбываліся ў нашым мясцовым настроі, каб захаваць свойскі дэкор сцэны, каб канферанс таксама адбываўся на сваёй мове. Так, на маю думку, павінна быць, бо калі пачнем пераходзіць на польскую мову, то хутка апалячымся. Заўважце, што сённяшняе маладое пакаленне Арлянскай гміны (вучні мясцовага Комплексу школ і крыху старэйшая моладзь — М. М.) ужо не ўмее размаўляць пасвойму (некаторыя ўмеюць — М. М.), а калі ў час беларускага фэсту выходзіць нехта на сцэну — войт, радны ці нейкі палітык — то будзе хвацка, калі ён загаворыць па-свойму, як умее — бо нашы людзі выводзяцца з розных мясцовасцей, у якіх розныя гаворкі — і моладзь гэта пабачыць, пачуе: „О, ён, важная асоба, не цураецца сваёй мовы"... І вось такім чынам мы ставім націск на сваю мову, каб паказаць тым маладым людзям, што нечага яе саромецца. Вельмі добра, што арлянская Гмінная рада прыняла пастанову пра ўвядзенне дапаможнай беларускай мовы. Я ведаю, што наша мова выклікае цікавасць у людзей звонку, у людзей з іншых рэгіёнаў Польшчы, якія дагэтуль нашай мовы не чулі. Іх наша мова захапляе, таксама наша культура, гісторыя, яны хочуць прыязджаць у Орлю. Яны пытаюць пра магчымасць куплі тут хаты, бо тут вельмі прыязныя людзі — гэта ўсе хваляць, тут чыстае паветра — толькі карыстацца гэтым! На маю думку ніякія курорты з процьмай атракцый не раўня нашаму спакою і свойскасці. У глыбіні краіны знаходзяцца людзі, якія перасяляюцца ў нашу гміну, добра тут акліматызуюцца, знаёмяцца з мясцовымі суседзямі, узаемна сабе дапамагаюць. І калі тыя новапасяленцы заедуць у свае даўнія месцы, яны расказваюць, што тут, на Падляшшы, жывуць цудоўныя людзі і заахвочваюць да нас.

Вяртаючыся да Арлянскіх сустрэч з багатай мастацкай часткай, дзе калектывы спяваюць па-свойму або пабеларуску, дык у той час стараемся ладзіць цыкл суправаджаючых мерапрыемстваў. Ад двух гадоў маем кулінарны кірмаш са свойскай кулінарыяй (з нашай і з суседніх — з Дубіцкай і Чыжоўскай гмін), дзе прыезджыя людзі маюць нагоду пакаштаваць мясцовых мясных — думаю, што такой каўбасы, як наша, у ніякім іншым месцы не купіць — ды кандытарскіх вырабаў. Свае вырабы паказваюць таксама нашы народныя мастакі, людзі з азартам, якія наступнаму пакаленню пакідаюць па сабе спадчыну: ці то вырабы з саломы, ці з бярозавых галінак, паперы, вышыванкі, разьба, малюнак. Бо гэта занікае і гэта, як Вы сам, спадар Мінцэвіч, заўважылі, трэба паказаць маладому пакаленню, каб яны ведалі, што і ў малым вясковым асяроддзі можна займацца складаным мастацтвам. Хачу тут прыпомніць майстар-класы па рукадзеллю, якія наша ўстанова ладзіла на працягу летніх канікул, дзе моладзь магла непасрэдна пабачыць майстэрні нашых творцаў, рабочы цыкл у іх і сама мела магчымасць спрабаваць гэтага занятку. Гэта дало такі плён, што маладыя людзі самі набіраюцца ахвоты наведаць народных мастакоў і самі хочуць нешта ствараць. Гэта цешыць, што расце новае пакаленне, якому адкрыты дзверы ў творчыя майстэрні.

— ***Чаму, на Вашу думку, людзі ідуць на беларускія фэсты?***

Фота Міхала МІНЦЭВІЧА

— Бо яны, ладжаныя цыклічна, прыжыліся. Людзі ідуць паслухаць вядомых ім калектываў ды пацікавіцца выступленнямі гасцей з Беларусі. І спадзяюцца, што будзе цікава, што будуць нейкія навінкі. Сёлета цікавасць публікі выклікалі танцы з агнём маладых беластачан ды пазнейшы паказ феерверкаў. Таму многія людзі не разыходзіліся па дамах, але яшчэ асталіся на танцы, бо і надвор'е паспрыяла.

— ***На якой мове размаўляеце з мастакамі з Беларусі?***

— Калектывы з Беларусі спяваюць па-беларуску і так размаўляюць. Але былі і такія асобы, што заўпарціліся і адказвалі толькі на рускай мове; мо яны па-беларуску не ўмелі, а мо прыкідваліся, што не ўмеюць, з гэтым бывае па-рознаму. Але калі я звярталася да іх па-нашаму, то разумелі.

— ***А чаго не можа бракаваць на беларускім фэсце ў Орлі?***

— Беларускай мовы і публікі. Фэст, на які людзі не прыйшлі б, не меў бы падставы існавання. Надпісы для публікі бываюць на беларускай мове. А апісанні прэзентаваных Вамі карцін былі на польскай і беларускай мовах.

— ***Ці здараецца яшчэ, што ў вёсках Арлянскай гміны бацькі звяртаюцца да сваіх дзяцей па-свойму?***

— Так, я сама так гавару да сваіх дзяцей. Бо ж хіба лягчэй і крыкнуць на іх па-свойму, напрыклад „Куды ты ідэш?", „Што ты робіш?" А мая бабуля, з 1924 года нараджэння, ніколі ў жыцці не звярталася да мяне папольску.

— ***А як у іншых вёсках?***

— Калі гаварыць пра 30-40-гадовых бацькоў, то большасць з іх звяртаецца да дзяцей на польскай мове. Добра, калі ў сем'ях ёсць яшчэ бабулі і дзядулі, якія з дзяцьмі гавораць пасвойму. Хаця здараецца, што і дзяды пачынаюць звяртацца да гарадскіх унукаў па-польску.

— ***Можа ўжо і ў нашых вясковых сем'ях гутараць па-польску?***

— Вядома.

— ***Ці гэта добра?***

— Гэта дрэнна, бо дзеці слухаюць. Я стараюся звяртацца да сваіх дзяцей па-свойму, а мой муж то нават пасвойму вучыць дзяцей вершаў і казак.

— ***Значыць, па вёсках пайшла асіміляцыя?***

— Часткова напэўна так. Але, сузіраючы нашу гміну, станоўча ацэньваю ўвядзенне тут у адміністрацыйны абарот дапаможнай беларускай мовы. І гэтыя беларускія мерапрыемствы, націск на свойскасць, на творчасць, на фальклор. У выніку гэтага ўнукі арлян, якія зараз вяртаюцца з гарадоў у бацькоўскія хаты, пачынаюць вучыцца мове продкаў быццам ад пачатку. Яны яшчэ не размаўляюць, але дапытваюцца пра паасобныя словы, што яны абазначаюць. Бо мову ведаюць са слыху. Такі наступіў час.

— ***Дзякую за размову.***

Гутарыў Міхал МІНЦЭВІЧ

Млын, які ўжо здаўна не меле

Адным з найменш вядомых помнікаў старадаўнасці ў Белавежы з'яўляецца несумненна мураваны млын з канца XIX стагоддзя. Малавядомы ён таму, што размешчаны ў даволі непрыкметным месцы — ва ўсходняй частцы Палацавага парку, на паўночна-ўсходнім беразе большай з дзвюх тут сажалак. Ад вуліцы Паркавай млын засланяе будынак былой электрастанцыі, ад сажалкі — дрэвы.

Млын уваходзіў у састаў г.зв. Палацавага пасёлка. Працаваў, абапіраючыся на электраэнергію, якую давала яму размешчаная па-суседску электрастанцыя. Аднапавярховы млын з паддашкам збудаваны быў з чырвонай цэглы, на падмурку з чэсанага граніту.

Падчас І сусветнай вайны млын быў спустошаны — частку абсталявання вывезлі адступаючыя з Белавежы ў жніўні 1915 года рускія, а тое, што засталося расцягнулі немцы і звычайныя мяшочнікі напрыканцы 1918 года.

У 1936 годзе ў памяшканнях млына адчынена была турбаза для жанчын. У адной зале стаялі некалькі дзесяткаў спружынных ложкаў з матрацамі і камплектамі пасцелі. Былі тут і ўмывальнікі з праточнай вадой, каналізацыя, цэнтральнае ацяпленне і электрычнасць. Турбаза была даступная праз увесь год. Падначальвалася яна Праўленню Нацыянальнага парку ў Белавежы.

Падчас гітлераўскай акупацыі немцы пратрымлівалі ў будынку арыштаваных жыхароў навакольных вёсак, а таксама рускіх ваеннапалонных, якіх дапытвалі і катавалі ў непадалёка размешчаным Егерскім доме (сёння знаходзяцца ў ім пошта і дзіцячы дом).

Фота Малгажаты КАРЧЭЎСКАЙ
Від на млын збоку сажалкі

Пасля вайны ў будынку абсталявалася на нейкі час пякарня. У 1957 годзе праклалі да яго новы водаправод.

У другой палове 1960-х гадоў памяшканні млына служылі выставачнай залай для палоцен, намаляваных падчас першых белавежскіх мастацкіх пленэраў. У ліпені 1970 года ў будынку адкрылася выстаўка п.з. „Паляўнічыя трафеі з Белавежскай пушчы 1945-1970". Наведала яе звыш 3600 чалавек.

Потым, праз многія гады будынак выкарыстоўваўся Белавежскім нацыянальным паркам у якасці склада будаўнічых матэрыялаў.

26 сакавіка 1980 года Ваяводскі захавальнік помнікаў старадаўнасці ў Беластоку занёс млын у спісак помнікаў старадаўнасці пад нумарам 486. 29 кастрычніка 1980 года будынак быў перададзены службе сувязі, якая намерваласа ўстанавіць у ім аўтаматычную тэлефонную станцыю. На жаль, неўзабаве аказалася, што будынка не ўдасца адаптаваць для такой мэты. Управа тэлекамунікацыі 16 красавіка 1982 года вярнула будынак Белавежскаму нацыянальнаму парку.

Зараз будынак надалей выкарыстоўваецца ў якасці склада. Напрыканцы 1970-х гадоў былі ўладжаны ў ім склепы для жыхароў будынка былой электрастанцыі, перароблена на шасцісямейны жылы дом.

Пётр БАЙКО

Рудня — мая вёска, любоў мая

Фота Міры ЛУКШЫ

Віктар Бура

Птушкі гэта Божае тварэнне, так рыхтык як у людзей — чалавек з хаты — гняздо астывае...

Шукаем знакаў свайго следу ў вёсцы Рудня, якой ужо няма. Штогод былыя жыхары гэтай вёскі збіраюцца ў царкве ў Юшкавым Грудзе, моляцца. Сустракаюцца пры помніку. Спатыкаюцца, углядаюцца ў шэрую плынь часу, каб угледзець у ім жывую душу сваіх родных, сяброў пражытай прасторы...

Бандарскія „блёкі" не могуць быць домам для людзей з былых вёск: Боўтрыкаў, Лукі, Гарбароў, Буд... Мусілі яны знайсці, гэтыя самотныя птушкі, іншае месца для сябе. Яны ні жывыя, ні мёртвыя — адзінокія, усё няўпэўненыя ў сваёй будучыні. Вельмі часта можна сустрэць на беразе былой вёскі Рудня яе жыхароў старэйшага пакалення і маладых руднян, якія як укамянелыя стаяць ля крыжа іхняй вёскі, задуманыя. Вернуцца да сябе жучынцамі ў свае шэрыя блёкі над Семяноўскім вадасховішчам... Мяжа, якая падзяліла два светы. Прорва, якая вярэдзіць душу і ўдзень, і ўначы. Быў свой дом у вёсцы Рудня. Дом пераймае галасы сваіх гаспадароў, іхнімі крокамі рыпяць маснічыны, грукае дзвярыма скразняк... У гэтай вёсцы жылі мудрыя людзі, захавальнікі старых абычаяў, культуры, песні. Адышлі яны многія з гэтага свету без пары. Ведалі яны мову птушак і раслін. Іхнія рупліва дагледжаныя садкі і агароды давалі дзівосны плён. Прыгожы свет глядзеў у вокны іхніх хатаў, хаты гдядзелі вокнамі ў родныя сады, на родны краявід. У гэтай прыгожай вёсцы гасцявалі боскія істоты, — хай сабе і божая кароўка, што раптам прачнецца сярод зімы на раме, калі бліжэй да вясны. Радасная істота, якой бліжэй да Бога... Разважаеш: а мо трэба было пачакаць, адчакаць крутыя і памылковыя помыслы нашых улад? Не дацца загнаць статкам у шэрыя блёкі? Не заліла б вада нашых вёсак?.. Разважаеш, спасылаючыся на пласты нацыянальнай міфалогіі, на свядомасць кожнага сумленнага чалавека, на святую бацькаўшчыну. На прыроду, народ, мову. Як цяжка ўсведамляць і пісаць тыя словы: „вымерлыя вёскі"!.. Людзі, быццам апамятаўшыся, ставяць каля кожнага паселішча крыжы-абярэгі, ускладваюць кветкі, запальваюць знічы... Спадзеючыся на іх, як на нейкую апошнюю інстанцыю?.. Позна. А што рабіць жыхарам шэрых блёкаў? Як вырашыць іхняе гаротнае становішча? Не толькі духовае, але і матэрыяльна-сацыяльнае...

Ужо чарговы год былыя жыхары вёскі Рудня вяртаюцца на свае сцежкі, якія абрываюцца ў вадзе. Сустракаюцца пры крыжы-помніку. Прыходзяць з імі суседзі і тыя, каму блізкая памяць роднай старонкі. Моляцца ў Юшкавым Грудзе, пасля ўпамінаюць адышоўшых. Пасля збіраюцца ў „Карына", аздобленае па-беларуску, дзе разам разважаюць, спадзеючыся спажыць не апошнюю вячэру. Рудняне-агранізатары штогадовых сустрэч горача заклікаюць прачнуцца, спаткацца, знайсці асабістае і супольнае. Спядзяюцца і на жыхароў іншых вёсак — каб арганізавалі падобныя сустрэчы.

Набалелыя словы, бывае, складваюцца ў верш...

Кажам мы шчыра: старасці баімся.
Яна нас прыгнятае і ў рукі дае кіёк.
Мы хочам прайсці шляхамі зямлі роднай Рудні праз поле, дзе сінелі калісьці васількі.

Тут у вянках наш крыж і абеліск. Сваіх жыхароў забыць так яму цяжка, нашай зямлі і палеткаў нашай Рудні — жыцця нашага калыскі. Дзе б не былі мы ад цябе далёка, Рудня — ты наша радасць і светлы выток. Яркае ззянне незагаслай зоркі. Любыя твае млын, мост і Грудок. Перад табою я заўжды ў даўгу. Абымі мяне, вятрыска-вецер, астудзі гарачае чало. Нашая адна, як каласок у свеце... Апусцела без нас вёска Рудня, то таму і ў царкоўку заходзім мы, каб свой боль пакласці на алтар. Свечачка паплача тут па кожным, душы ўпамяне наш Славамір-святар... Не спяшаем сцежкай да нашых хат, бо няма там старых дарог... Ціхія высокія бярозы звесілі голле над крыжам у журбе... Боль сціскае нашы сэрцы.

Разам з намі былі і нас успамаглі 19 верасня, і дзякуй ім за гэта — бурмістр гміны Міхалова Марк Назарка, Польскае тэлебачанне з „Беларускім тыднем", Радыё „Рацыя" з Беластока тэлежурналісты з праграмы „Карані" з Беларусь-ТВ, журналістка з „Нівы" Міра Лукша, Славамір Іванюк — віцэ-старшыня Беларускага гістарычнага таварыства (ён прывёз нам даклад), Галена Леман — турыстка з Гданьска, што аблюбавала нашу старонку і спецыяльна прыехала на нашу сустрэчу. Дзякуем айцу Славаміру Тафілюку з нашага прыхода Юшкаў Груд за малітву, царкоўнаму хору за спеў. Мы ўдзячны таксама і спонсарам — гайнаўскаму Акруговаму малочнаму кааператыву і яе старшыні Веры Паўлючук, кветачнаму магазіну „Агатка" ў Гайнаўцы і спадару Міраславу Філіпюку ды Аліне і Ромку Ляткоўскім.

Віктар БУРА

http://bellib.org

Беларускую класічную літаратуру можна без перабольшання назваць вечнай. І гэта не гучныя словы — да яе цягнуцца людзі, якія, па вялікім рахунку, хочуць толькі дакрануцца да слоў Купалы, Коласа, Багдановіча і іншых нашых літаратараў, каб неяк спрычыніцца да таго, што завецца беларускім словам. Толькі так і можна патлумачыць нядаўняе з'яўленне ў Байнэце сайта з гучнай назвай „Бібліятэка беларускай літаратуры".

Нягледзячы на шматабяцаючую назву, уласна сайт, што месціцца па адрасе http://bellib.org, выглядае пакуль не надта прыцягальна. Ягоная напоўненасць інфармацыяй дацягвае на даны момант усяго толькі да бібліятэчкі з некаторымі творамі беларускіх літаратараў. Але гэты недахоп з цягам часу абавязкова выправіцца, калі, канешне, уладальнікі сайта зацікаўленыя ў развіцці свайго партала.

Першая старонка сайта, якая адначасова з'яўляецца і галоўнай, уяўляе з сябе бела-блакітнае выяўленне. Якіх-небудзь аздабленняў там няма. Таму спачатку ў інтэрнэт-карыстальніка можа ўзнікнуць уражанне, што гэта нейкая тэхнічная бачына ў Сеціве, якую распрацоўшчыкі яшчэ не паспелі давесці да лагічнага завяршэння. Аднак, крыху прыгледзеўшыся, заўважаеш, што гэта такі стыль сайта.

З першай жа старонкі аўтары „Бібліятэкі" звяртаюцца да чытачоў з пранікнёнымі словамі аб турботах за родную мову і літаратуру. „Наш сайт адрасаваны тым, хто хоча больш ведаць пра развіццё беларускай літаратуры, пра жыццё і творчасць вядомых і яшчэ не вельмі вядомых песняроў беларускай зямлі, тым, чыё сэрца баліць за лёс роднай мовы, — пішуць стваральнікі сайта. — Цярністы шлях прайшла беларуская літаратура, пакуль дасягнула вяршынь свайго развіцця. Сягоння мы з хваляваннем і гонарам вымаўляем імёны Еўфрасінні Полацкай, Францыска Скарыны, Кірылы Тураўскага, Міколы Гусоўскага і іншых. Гэта яны пасеялі першыя зярняткі, з якіх пачала зараджацца беларуская мова і літаратура".

Даны зварот з пачатку і ў завяршэнні аздоблены словамі з вершаў Алеся Гаруна аб недапушчальнасці адрачэння ад беларускай мовы. Зважаючы на сённяшні стан яе, мусіш канстатаваць, што гэтыя словы паэта пакуль не надта кранаюць тых, каму яны адрасаваны.

Сайт мае мноства рубрык. Выйсці да іх месцяцца з левага боку выяўлення. Усе яны падзяляюцца на тры часткі. Першымі ідуць „Творы". Другая частка — гэта „Аўтары", а трэцяя — „Біяграфіі". Уласна рубрыкі пакуль не ўсе запоўненыя інфармацыяй. Так, на гэты час застаюцца пустымі „Апавяданні" і „П'есы".

Найбольш поўна ў першай частцы прадстаўлены „Байкі". Там знаходзяцца не толькі выйсці да баек, але і падаецца падрабязны расповед пра гэты жанр творчасці.

Пералік выдатных літаратараў на даным сайце пакуль зусім малы. Зараз тут толькі дванаццаць прозвішчаў. Практычна да кожнага прозвішча паэта ці пісьменніка падаецца даволі інфарматыўны біяграфічны расповед, а таксама творы. Праўда, чамусьці распрацоўшчыкі сайта пагрэбавалі партрэтамі літаратараў, таму тэксты выглядаюць крыху сумнавата.

Сярод недахопаў і пераваг сайта кідаецца ў вочы адна недарэчнасць. Нягледзячы на размешчаныя на галоўнай старонцы заклікі аб любові да беларускай мовы, назва сайта падаецца чамусьці па-руску.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Развязка блізка

Вялікая футбольная субота не пакідала варыянтаў у выбары тэмы чарговага спартовага выпуску. Перадапошнія адборавыя матчы да чэмпіянату свету маглі вызначыць бальшыню ўладальнікаў запаветных пуцёвак на чарговы чэмпіянат свету, які пройдзе ў наступным годзе, а таксама зборныя, што зоймуць другія месцы і працягнуць змаганне ў плэй-оф. Развязка наступіла ў сямі групах і толькі ў двух кампаніях сітуацыя засталася заблытанай да гэтай серады. Нагадаю, што датэрмінова і без усялякіх праблемаў сваё права гуляць на сусветным форуме ад Еўропы заваявалі Англія, Іспанія і Нідэрланды. Пасля суботы да іх далучыліся яшчэ чатыры дзяржавы з футбольнымі традыцыямі.

У першай групе сустракаліся непасрэдныя прэтэндэнты — Данія і Швецыя. Мінімальная перамога 1:0 гарантавала суайчыннікам казачніка Андэрсена першую пазіцыю. Другую без сумневу ўтрымаюць партугальцы. У другой кампаніі Швейцарыя і Грэцыя здабылі буйныя вікторыі і ў апошнім туры павінны былі вызначыць, хто адразу зойме прыярытэтнае месца, а каму давядзецца яшчэ панервавацца. У трэцяй групе ўсё перавярнулася кардынальна. Славаччына, якой да вялікай мары заставалася зрабіць маленькі крок, нечакана саступіла дома яшчэ гады два таму зусім нягеглай Славеніі — 0:2. Славенцы напэўна перамогуць у апошняй сустрэчы Сан-Марына, а вось славакам, каб здабыць „чысты" білет, патрэбна перамагаць у гасцях Польшчу. У выніку калізій фактычна за бортам засталася Чэхія. У чацвёртым секстэце Расея ўпершыню ў гісторыі саступіла дома ў адборавым матчы да першынства свету, прытым галоўнаму саперніку — Нямеччыне — 0:1. Цяпер тэўтонцы могуць цешыцца, а маскоўцы працягнуць шукаць шчасця. У пятай групе Боснія і Герцагавіна сваімі рукамі заваявала другое месца і пакінула без чэмпіянату Турцыю. У моцнай сёмай кампаніі Сербія ў выніку справядліва абставіла Францыю, што пацвердзіў разгром балканцамі яшчэ нядаўна грозных румынаў — 5:0. У восьмай групе сустракаліся галоўныя канкурэнты Ірландыя і Італія. Вынік 2:2 прынёс жаданае месца апенінцам, а брытанцы ў выніку фіяска балгараў ад кіпрыётаў 1:4 забяспечылі сабе другі радок у табліцы.

Нарэшце ў нашай шостай групе Украіна перамагла дома Англію — 1:0. Ні то жоўта-блакітныя здзейснілі подзвіг, ні то брытанцы спаўна расплаціліся з харватамі, якія не пусцілі іх на апошняе еўрапершынство. Харватам застаецца кусаць локці, альбо наіўна спадзявацца, што ўкраінцы не адолеюць у апошнім матчы Андору. Што датычыць зборнай Беларусі, то яна завяршыла выступ у цыкле перад сваімі гледачамі на мажорнай ноце. У Брэсце падначаленыя Бернда Штанге разграмілі з лікам 4:0 Казахстан. Галы забілі Максім Бардачоў, Цімох Калачоў (два) і Леанід Ковель. Што тут можна сказаць? Беларуская дружына ўжо навучылася гуляць з аўтсайдарамі. Пра гэта сведчыць і той факт, што па забітых галах нашы хлопцы ўваходзяць у васьмёрку найбольш выніковых зборных старога свету ў гэтай кампаніі. На большае ж пакуль не здатныя.

Моладзевая беларуская дружына на гэты раз расчаравала. У прынцыповым, а мажліва і ключавым матчы супраць Шатландыі на яе полі хлопцы саступілі — 0:1. Крыўдна, але адзіны мяч быў забіты на 93-й хвіліне.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Тут аж пярэста ад скарбаў!

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

— На карце Падляшша на Гайнаўшчыне і Бельшчыне аж густа ад значкоў, памечаных як месцы скарбаў будаўнічага драўлянага майстэрства і беражлівага іх захоўвання, — заявіў Антоні Масевіч, старэйшы захавальнік Музея сельскай гаспадаркі імя Кшыштафа Клюка ў Цеханоўцы, суарганізатара, разам з Маршалкоўскай управай Падляшскага ваяводства, ужо пятага выпуску, Конкурсу на найлепш захаваны помнік вясковага драўлянага будаўніцтва.

— На конкурс аб'екты заяўляліся гмінамі ды індывідуальна. З 84 заяў 24 былі індывідуальныя, а 5 асабістых, пры нагодзе візіту этнографаў у мясцовасці. Людзі даведваліся таксама з прэсы. Старэнькай спадарыні Воўк з Бахуроў падказаў унучак і яна заявіла сваю хату на конкурс. Галоўнае, што людзі маюць ужо свядомасць, што драўлянае будаўніцтва гэта не прыкмета беднасці, бяздарнасці і адсталасці, толькі пачуцця хараства, свядомасці эстэтыкі, ушанавання для культуры продкаў ды гаспадарлівасці, — дадаў вядомы этнограф родам з Ліды.

Найбольш да конкурсу было заяўлена жылых дамоў — 54. З гаспадарчых будынкаў у конкурсе разглядаліся 9 стадол, 9 свірнаў, 4 аборы. Іншыя драўляныя цуды гэта 2 ветракі, вадзяны млын, 2 школы, плябанія, кузня ды маладзёжная турбаза. Варта дадаць, што аж у сямі выпадках былі заяўлены больш чым адзін аб'ект з аднае гаспадаркі. Будынкі знаходзяцца на тэрыторыі адзінаццаці паветаў (26 гмін). Найбольш аб'ектаў было заяўлена з Гайнаўскага павета — 25, з Беластоцкага — 19, з Бельскага — 6. Пакуль толькі адзін аб'ект быў з Сакольшчыны, ды гэта па прычыне нерухавасці гмінных улад. Бо якраз дзякуючы руплівым пошукам і працы ў гмінах асоб, такіх як Іаанна Белавежац (Чыжоўская гміна), Барбара Астапчук (Гайнаўская гміна) ці Цацылія Галіцкая (Заблудаўская гміна) можна гаварыць аб поспеху адкрыцця скарбаў драўлянага будаўніцтва па вёсках. У большасці гэта будынкі з XX стагоддзя (да 1956 г. пабудовы). У XIX ст. збудаваных было 6 аб'ектаў. Найстарэйшыя будынкі заяўленыя на конкурс гэта хата з Макаўкі (1867 г.) ды будынкі ў гаспадарцы ў Еглінцы (Сувальшчына). У большасці будынкі з'яўляюцца прыватнай уласнасцю, апрача 5 аб'ектаў — будынка рэгіянальнага музея ў Рыбалах, свірна ў Новаберазове, маладзёжнай турбазы ў Белавежы, народнага дома ў Саколі і плябаніі ў Пунску. Заяўлены жыллёвыя будынкі былі ад тыпова скансэнаўскіх, да зусім мадэрнізаваных. Вядома, найбольш цаніліся тыя першыя, з архітэктурнымі аздабленнямі навонкі, мэбляваныя таксама па-даўнейшаму. У шмат якіх выпадках няўмела праводжаныя рамонты (сайдынг, пластмасавыя вокны, да таго з іншым падзелам шыб, бляхі на даху) значна паніжалі архітэктурную каштоўнасць аб'ектаў і шкодзілі захаванню помніка ў будучыні.

Яўген і Ніна Лукашукі з Чыжоў — пераможцы конкурсу — шануюць традыцыю продкаў

Другое месца здабыў між іншым Музей матэрыяльнай культуры „Бацькаўшчына" ў Рыбалах, пад апекай праваслаўнага прыхода

Першую ўзнагароду ў конкурсе здабыла цэлая гаспадарка ў мясцовасцы Чыжы, 96, якая складваецца з дома, клуні, інвентарскага будынка, свірна, студні і склепа. Журы ацаніла стан іх захавання і цэласць усяго комплексу.

— Хто заявіў вашу хату і ўсю гаспадарку? — пытаемся ў пераможцы, Яўгена Лукашука, які прыехаў у Цехановец з жонкай Нінай з Гайнаўкі, дзе пакуль жывуць у блёку. Яўген працуе ў варштатах у школе.

— Наша матуля, Ганна. Яна жыве там пакуль адна, але і мы туды пераселімся. Пакуль што трэба там усё парамантаваць — працякае дах, падлогі ўжо пачынаюць ламацца, а і пра вокны няма што гаварыць! Наша хата, як мне калісь казалі мама з татам, была перавезена ў 1939 годзе са школы ў Новым Корніне сюды, у Чыжы.

Другую ўзнагароду атрымала хата з 1867 года з Макаўкі, 22, са страхой дымнікавага тыпу, які сваім кшталтам выводзіцца яшчэ з часоў курных хат. Хата сапраўды архаічная — са старажытным раскладам пакояў, з масіўнай печчу для пячэння хлеба, з каптуром, з ляжайкай, сцяноўкай, комінам, з бэлькай-трамай. Гэтая хата захавала шмат дробных элементаў абсталявання рэліктавага характару.

— А дзе ж ваша чатырох'ярусная буслянка? — пытаюся ва ўласніка хаты Яна Пагажэльскага, будаўніка дарог па прафесіі. Памятаю гаспадыню, паню Станіславу, якую я ладных пару гадоў убачыла ў гэтай хаце як з мінулага стагоддзя, у сарафане ды босую, як глядзела свайго сляпога мужа. На жаль, вечнае гняздо звалілася, буслянят макаўцы вазілі да ветэрынара.

Другое месца здабылі таксама хата з Ліпшчан (Ліпская гміна) ды будынак былой вясковай школы (1924 г.) у Рыбалах (Заблудаўская гміна) — цяпер Музей матэрыяльнай культуры „Бацькаўшчына", пад апекай праваслаўнага прыхода (айцец Рыгор Сасна вельмі хваляваўся і цешыўся візітам у Цехановец — сустрэў тут цеханавецкіх прыхаджан з часу, калі 40 гадоў таму пачынаў службу Богу). Трэція ўзнагароды атрымалі Васіль і Анна Галёнкі (Чыжы, 133), Тамара Яўдасюк (Дабрывада, 7), хата Расціслава Кунцэвіча з 1905 г. у Хітрай (43) Гайнаўскай гміны. Вылучаны былі таксама чыжоўскія хаты — Яўгена і Анны Тамашукоў (Чыжы, 155), Ірыны Кандрацюк і яе мамы Анны Філіманюк (Чыжы, 152), вятрак Рыгора Рыбака ў Тафілаўцах Дубіцкай гміны, кладоўка ў Новаберазове (уласнік — праваслаўны прыход), хата Вольгі Сегень у Трывежы (14), хата ў Масеве (18) прыезджай Анны Тамаровіч, хата з 1932 г. і стадола сям'і Дануты Мялешка з Калёніі Сольнікі (49) ды хата Збігнева Мінко з Заязерцаў (18) Заблудаўскай гміны. Можна сказаць, што зноў Чыжы гарой!

— Узнагарода прыдасца на рамонт! — цешыцца пераможца. Узнагароджаныя аб'екты будуць памечаны спецыяльнай таблічкай, інфармуючай аб іх каштоўнасці і значэнні як помніка даўніны.

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Сельмы Лагерлоф.

1. пухліна, якая ўзнікае па прычыне лішняй вадкасці ў тканках = 9 _ 6 _ 7 _ 8 _;
2. адчуванне фізічнай або маральнай пакуты = 15 _ 16 _ 17 _ 18 _;
3. горад у Калінінградскай вобласці Расіі, ранейшы Гумбінен = 11 _ 5 _ 4 _ 14 _ 10 _;
4. чалавек, які слепа трымаецца моды і манераў элітарнага саслоўя = 32 _ 13 _ 34 _ 33 _;
5. зямная паверхня не занятая вадою = 20 _ 1 _ 19 _ 21 _;
6. атрутны вокіс вугляроду = 2 _ 3 _ 23 _;
7. вострая інфекцыйная хвароба Альбера Камю = 30 _ 29 _ 28 _ 31 _;
8. дзяржава з Сант'яга = 26 _ 27 _ 22 _ 12 _;
9. між Невадай і Каларада = 35 _ 25 _ 24 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 37 нумара

Клумба, арол, малако, Іркуцк, Вена, ляда, ісцец, гарыла, валацуга, Караян.

Рашэнне: **У маладосці невялікая галава.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Агнешцы Чапко** з Сямятычаў і **Міхалу Байко** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Тэкст і фота
Ганны КАНДРАЦЮК

У Мастаўлянах усе нараджаліся маленькімі (8)

(пачатак у 33 н-ры)

У Мастаўлянах добра ведалі як трэба гаварыць пра Каліноўскага.

25 верасня 2009 года ў Менску прайшла міжнародная навуковая канферэнцыя пад загалоўкам „Кастусь Каліноўскі і яго эпоха ў дакументах і культурнай традыцыі". Падзеі спадарожнічалі вялікія эмоцыі, паколькі асоба Каліноўскага, паводле гісторыкаў, стала выклікаць неадназначную рэакцыю ў дзяржаўных ідэолагаў. Карацей, ідзе спроба ліквідацыі Кастуся Каліноўскага як нацыянальнага героя. У падручніках па гісторыі Беларусі для 10-га класа паўстанне 1863-64 гадоў названае „польскім паўстаннем на беларускіх землях", а сумнавядомы Міхаіл Мураўёў-Вешальнік — „таленавітым адміністратарам".

Ад вандроўкі па бацькаўшчыне рэвалюцыянера астаўся яшчэ адзін нясмачны ўспамін. Асоба Каліноўскага, ці то ў Ялоўцы, ці то ў Мастаўлянах, падавалася заўсёды ў кантэксце Берасцейскай уніі. Праўда, сам рэдактар „Мужыцкай праўды" заслужыў на такі падарунак. Як вядома, славуты „Яська гаспадар з-пад Вільні" сам сябе, каб прыдабрыцца мужыку, называў уніятам. Вядома таксама, што пад псеўданімам таго ж гаспадара „Яські", хаваліся тры-чатыры асобы, з ліку якіх у сапраўднасці ніхто не быў уніятам!

* * *

Другі раз у Мастаўляны я завандравала вясною 1996 года. Разам з грамадой дзетак і моладзі, якія з'ехаліся ў Бандары на III Сустрэчы „Зоркі". Будучы ў наваколлі, мы не маглі абмінуць такога месца, а асоба Кастуся Каліноўскага ў той час была важнай у працэсе адукацыі. Спачатку мы паехалі ў Ялоўку. Паколькі ў гэты дзень выпалі праваслаўныя Грамніцы, спачатку мы ўсе пайшлі на багаслужбу. Пасля настаяцель з матушкай запрасілі нас на плябанію пагрэцца. Хоць было нас за сорак асоб, усім знайшоўся гарачы пачастунак і шчырае беларускае слова. Айцец Яўген Канаховіч, як начытаны і бывалы чалавек, не здзіўляўся, што хочам наведаць Мастаўляны. У той час Кастусь Каліноўскі ўспрымаўся адназначна, як беларускі патрыёт і змагар. Праўда, мала хто тады ведаў пра яго крытычнае стаўленне да праваслаўя і расіян. На радзіме Каліноўскага сустрэлі нас з не меншай цеплынёй і адкрытасцю. На панадворку, дзе нарадзіўся Вікенцій Канстанцін, мы наладзілі жывы ўрок гісторыі. Пра славутага ўраджэнца (пра якога ўсе вучыліся ў школе) распавялі нам гісторыкі Лена Глагоўская і Алег Латышонак. Пра Каліноўскага, як узор адвагі, гаварыў таксама мастак Лёнік Тарасэвіч. Якраз у яго Валілах праходзіла славутая сутычка паўстанцаў з царскім атрадам. Пры цэлай гэтай інтэлектуальнай і мастацкай раскошы не хапала, аднак, матэрыяльных слядоў, якія самі сабой узбуджаюць мышленне і ідэі. На здаровы розум тут павінен быць музей або хоць камень з інфармацыяй пра найбольшага ўраджэнца Свіслаччыны. Так ці інакш, гэты недахоп, здавалася тады, будзе выпраўлены ў будучыні. Тое, што пойдуць спробы выкінуць Каліноўскага з падручнікаў гісторыі Беларусі, не прыходзіла нават у чорных снах!

Сустрачанская кадра (справа Лена Глагоўская, Алег Латышонак, Лёнік Тарасэвіч, Тамаш Саевіч) з мастаўлянцамі

Мастаўляны 1996 г, III Сустрэчы „Зоркі". Жывы ўрок гісторыі на панадворку Кастуся Каліноўскага

* * *

Ходзячы па слядах паўстанцаў, міжволі адчуваецца кашмар беларускага лёсу. Экстрэмізм, з якім выходзяць паўстанцы, шакіруючы не толькі для беларускага мужыка. Не дарма Сакрат Яновіч сваіх аднапляменцаў называе бацькамі сусветнага тэрарызму, а яго пачынальнікам — Каліноўскага!

У архіўных матэрыялах знаходзім „Прыказ" Канстанціна Каліноўскага з пачатку лета 1863 года. Прыказ гродзенскага камісара меў быць зачытаны ў кожнай вёсцы.

Ронд Польскі, паставіўшы мяне над вамі, вымагае, каб я глядзеў справядлівай вольнасці і праўды і каб вы адно рабілі так, як вам ад Ронду Польскага будуць прыказываць. Прыняўшы гэта на сябе, глядзеці буду як патрэба — над людзьмі добрымі буду справядлівы, а над ліхімі ніякага змілавання не будзе. Хто будзе за Рондам Польскім, той дастане зямлю на вечнасць і, калі захоча, вернецца на сваю даўнейшую ўніяцкую веру, а хто проціў Ронду Польскага, таму агонь і шыбеніца. Маскаль, не маючы ўжо войска колька яму трэба і не могучы ўзяці рэкрута, пускаецца на хітрасць — хоча з вас узяці міліцыю, а после зусім на маскалёў перарабіці. Каб не дапусціць да гэтага, ад імені Ронду Польскага прыказываю вам: Калі прыйдзе да вас шмат войска маскоўскага, то вы перад німі як рабы, маўчыце, а калі іх мала застанецца, каб з вас рабіці міліцыю, то вы зараз давайце знаць да паўстанцаў, а яны маскалёў як пацукоў выдушаць.

Гэты кашмарны фрагмент загаду, надрукаваны ў маніфесце „*За нашу вольнасць*", парадаксальна мае адукацыйную каштоўнасць. Такія менавіта кветкі выспяваюць ад паліцыйнай трактоўкі гісторыі.

Мастаўляны 2009 г. У будынку былой школы

17.10 — 23.10

(22.03. — 20.04.) Лепш са здароўем. Поўня Месяца вызначыць новы раздзел, цалкавіты „зварот акцыі". Рассакрэцяцца таямніцы, якія перад табой хтосьці вельмі хаваў. 19-23.10. хтосьці схоча ўвесці цябе ў зман або табе зашкодзіць. Разлічвай тады выключна на сябе самога.

(21.04. — 21.05.) Ад нейкіх прыемнасцей мусіш адмовіцца, іх месца зойме абавязак (не такі цяжкі, як думаеш). Пільная і нецікавая праца можа прынесці немалыя прыбыткі. Падарожжы (асабліва службовыя) могуць не ўдацца. Не ўпусці нагоды на цікавае знаёмства і яго працяг. У фінансах без змен, нават нейкі застой.

(22.05. — 22.06.) Будзеш увесь час моцна заняты. Цудоўныя перажыванні гарантуе табе Венера і людзі будуць да цябе проста ліпнуць. Можа дайсці да цябе інфармацыя пра прыкрае здарэнне. 18-22.10. — вельмі добры час на інтарэсы і творчасць.

(23.06. — 23.07.) Будзеш мець агромную сілу, каб увесці неабходныя ды трывалыя змены. Выкажашся вялікай вынаходлівасцю і сілай характару. Будзь больш прадбачлівы і звяртай увагу на дэталі. Дома цяжкія справы лагодзь адразу, нічога не замятай пад дыван.

(24.07. — 23.08.) Да 19.10. твая інтуіцыя цябе не падвядзе, асабліва ў справах планавання. Марс абдорыць цябе магутнай сілай, рашучасцю, харызмай і выразнасцю. За што не возьмешся, удасца. Нават калі ты яшчэ ў фінансавым доле, выбярэшся з яго хутка. Поспехі ў другога полу. Можа толькі кепскавата са сном.

(24.08. — 23.09.) Могуць вярнуцца былыя жалі і прэтэнзіі да некаторых сваякоў (не выцягвай трупа з шафы і не калупайся ў мінулым). Затое на працы ці ў школе многа прыемнасцей і задавальнення. Можаш шмат дасягнуць ды і зарабіць. 18-22.10. маеш геніяльны нос да інтарэсаў; прыпомні шэфу пра падбаўку.

(24.09. — 23.10.) Будзеш больш ашчадны і разважлівы ў планаванні выдаткаў. Аптымізм, радасць, кампанейскія поспехі і ўдалыя любоўныя заваёвы. Ідэальны лад у хаце (толькі больш давярай дзецям). Можаш добра памагчы несправядліва патрактаванаму сябру.

(24.10. — 22.11.) Ахвота падпарадкаваць сабе партнёра і зайздрасць без падстаў могуць папсаваць твае адносіны ў пары. Павыкідвай непатрэбшчыну з хаты. Твае амбіцыі возьмуць верх і схочаш даказаць сваё першынство. Трымайся сваіх прынцыпаў і не аглядвайся на іншых. З 22.10. рушыш уперад поўнай парай. Будзеш моцны, упэўнены ў сваіх рацыях.

(23.11. — 22.12.) Добры час. Усё пойдзе згодна з тваёй думкай. Кожную тваю ідэю падхопяць (будзеш стратэгам!), а цябе пахваляць. Дом гэта не аазіс спакою, бо будзе турбаваць і трывожыць хтосьці старэйшы. Можаш разлічваць на партнёра і сябра, які ведае пра цябе ўсё.

(23.12. — 20.01.) Дасканала будзеш адчуваць сябе ў новым асяроддзі. Казярогі (асабліва студэнты) могуць сустрэць ідэальную асобу на будучыню: магчымае пажыццёвае каханне! Найлепш дагаворышся з жанчынамі. Твае таленты і цяжкая праца будуць заўважаны.

(21.01. — 19.02.) Шчасце і добры настрой. Маладзік Месяца (18.10.) пачынае добры час на студыі, курсы. Не бойся ісці напралом у важных справах. Пастаў на самастойнасць і творчасць на працы, старайся ісці сваёй дарогай.

(20.02. — 21.03.) На працы прымі пазіцыю стражніка, а не ваяра. Не ўваходзь у ніякія суполкі аж да 28.10., не кранай жалезнага запасу сродкаў. Дома і сярод сяброў спакойна. Адно крыху панаракаеш на сваё задароўе.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960